Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. ЧАЦВЕР № 196 (29818)

ШТО ЧАКАЕ ЛІТОЎЦАЎ

4

АСАБЛІВАСЦІ ПЕРАХОДНАГА ЎЗРОСТУ

Сямейная плошча

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей БЯГУН, начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС:

«Грамадзяне Украіны па-ранейшаму актыўна прыбываюць у нашу рэспубліку. Пытанні падтрымкі тых, хто знаходзіцца ў цяжкай сітуацыі, з нядаўняга часу рэгламентуе Указ Прэзідэнта № 326. Кіруючыся ім, праваахоўнікі ў паскораным парадку разгледзелі больш за 3 тысячы хадайніцтваў аб выдачы дазволу на часовае пражыванне і больш за 1,7 тысячы — на пастаяннае. Акрамя таго, больш за 1,8 тысячы ўкраінцаў звярнуліся па прадастаўленне статусу бежанца або дадатковай абароны. Зараз рыхтуецца да запуску анлайн-платформа, дзе будзе апублікаваны пералік арганізацый, што прадастаўляюць дапамогу людзям, якія прыбываюць з суседняй дзяржавы. Старт праекта запланаваны на лістапад».

ЛІСТАПАД ПРЫХОДЗІЦЬ У КАСТРЫЧНІКУ

Фота БелТА.

Восень у Гомельскім палацава-паркавым ансамблі.

КАРОТКА

• Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Таджыкістана Эмамалі Рахмонам. Кіраўнік беларускай дзяржавы цёпла павіншаваў свайго калегу з юбілеем. Кіраўнікі краін зверылі гадзіннікі па асноўных пытаннях двухбаковых адносін.

• **«Сям'я. Адзінства. Вернасць». Пакроўскі фестываль пройдзе 8—16 кастрычніка ў Мінску.**

• Міжнародная асацыяцыя бокса адмяніла адхіленне беларускіх атлетаў.

ISSN 1990 — 763X

БЕРАЖЫЦЕ БАЦЬКОЎ

Як пажылым пазбегнуць непрыемнасцяў?

Пажылыя людзі па-ранейшаму застаюцца найбольш уразлівай катэгорыяй насельніцтва, якая патрабуе павышанай увагі з боку прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп грамадства. Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях заўсёды трымаюць пенсіянераў у полі зроку — асабліва адзінокіх або тых, хто пражывае адзін і з розных прычын не можа разлічваць на дапамогу блізкіх. З улікам узроставых асаблівасцяў пажылыя людзі не заўсёды могуць паклапаціцца аб сваёй бяспецы. Невыпадкова дадзенае пытанне бяруць на сябе ратавальнікі, падключаючы моладзь.

СТАР. 3

На слыху

БЕСПІЛОТНЫ І ЭЛЕКТРЫЧНЫ ТРАНСПАРТ: ШТО ПРАПАНУЮЦЬ БЕЛАРУСКІЯ ВУЧОНЫЯ

Аб'яднаны інстытут машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сёлета святкуе 65-годдзе. Ён працуе ў рэчышчы сусветных трэндаў, і вынікі яго работы запатрабаваныя ў беларускай прамысловасці. Яго дзейнасць — навукова забеспячэнне, арганізацыя і каардынацыя работ па стварэнні экспартна арыентаванай аўтатрактарнай і камбайнавай тэхнікі, якая абсталявана шматузроўневымі інтэграванымі электроннымі сістэмамі адаптыўнага кіравання. Гэта таксама работа над новымі кампазіцыйнымі, палімернымі, металічнымі, нана- і мікраструктураванымі матэрыяламі. Нядаўна з'явіўся зусім новы напрамак дзейнасці — беспілотны і электрычны транспарт. Што тут новага, якіх навінак чакаць у дадзенай сферы? Аб гэтым журналістам расказалі генеральны дырэктар Інстытута Сяргей ПАДДУБКА і начальнік навукова-інжынірынгавага цэнтра «Электрамеханічныя і гібрыдныя сілавыя ўстаноўкі мабільных машын» інстытута Аляксандр БЯЛЕВІЧ.

СТАР. 13

НЕ БОЛЬШ ЗА ДЗЕСЯЦЬ ПАКОЯЎ, НЕ МЕНШ ЯК ДЗВЕ ПАСЛУГІ

Што мяняецца ў сферы аграэкатурызму

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 351 «Аб развіцці аграэкатурызму». Дакумент накіраваны на ўдасканаленне рэгулявання дзейнасці ў сферы аграэкатурызму, павышэнне якасці паслуг, выключэнне магчымасці весці гасцінічны або рэстаранны бізнес пад выглядам аграэкасядзіб, абарону правоў грамадзян, якія пражываюць у суседстве з імі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Указам удакладнены патрабаванні да аб'ектаў аграэкатурызму. У прыватнасці, гэта датычыцца колькасці жылых пакояў для аграэкатурыстаў, іх павінна быць не больш за дзесяць. Ёсць таксама ўдакладненні па вядзенні асабістай падсобнай гаспадаркі і колькасці аказваемых у комплексе відаў паслуг — не менш як дзве.

Пералік паслуг дапоўнены правядзеннем майстар-класаў, накіраваных на азнаямленне навед-вальнікаў з рамёствамі і нацыянальнымі традыцыямі рэгіёна.

Устаноўлена адказнасць уладальнікаў аграэкасядзіб за парушэнне (у тым ліку з боку наведвальнікаў) грамадскага парадку або спакою грамадзян, невыкананне заканадаўства ў сферы санітарна-эпідэмічнага дабрабыту насельніцтва, прыродаахоўных, проціпажарных патрабаванняў.

Уведзены абмежаванні па правядзенні прэзентацый, юбілеяў, банкетаў, іншых мерапрыемстваў у непасрэднай блізкасці ад суседніх жылых дамоў.

Устаноўлена неабходнасць атрымання ў райвыканкамах дазволу на вядзенне дзейнасці ў сферы аграэкатурызму. Дзеючыя аграэкасядзібы павінны атрымаць такі дазвол да 1 ліпеня 2023 года.

Па выніках нарады Прэзідэнта з кіраўніцтвам Савета Міністраў 9 верасня 2022 года ў мэтах стварэння дадатковых умоў для развіцця аграэкатурызму ў глыбінцы аблвыканкамы надзелены правам вызначаць пералікі населеных пунктаў, на тэрыторыі якіх размяшчэнне аграэкасядзіб не дапускаецца. Разам з тым прадугледжана магчымасць прадаўжэння работы існуючых аграэкасядзіб на такіх тэрыторыях пры ўмове выканання іншых патрабаванняў указа.

Парламенцкі дзённік

ТАКАЯ ВАЖНАЯ ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

Наталля КАЧАНАВА правяла прыём грамадзян у Салігорску

Члены Савета Рэспублікі 5 кастрычніка правялі адзіны прыём грамадзян у гарадах Мінскай вобласці. У гэты дзень парламентарыі наведалі ўсе раёны сталічнага рэгіёна, выслухалі запыты і прапановы. Сустрэча са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай адбылася ў Салігорску. Кожнае з разгледжаных пытанняў узята на кантроль і абавязкова будзе вырашана. Без увагі не застаўся ні адзін зварот.

Фота БелТА

— Традыцыйна мы праводзім асабістыя сустрэчы з грамадзянамі штомесяц. Сёння мае калегі, члены Савета Рэспублікі працуюць у розных раёнах Мінскай вобласці, каб сустрэцца з людзьмі і выслухаць іх праблемы. Некаторыя з пытанняў, якія мы пачулі ад грамадзян, трэба ўрэгуляваць на заканадаўчым узроўні. Для нас вельмі важная зваротная сувязь. Працуючы над тым ці іншым нарматыўна-прававым актам мы, канешне, выкарыстоўваем інфармацыю, якая паступае ад людзей на месцах: наколькі эфектыўная тая ці іншая норма, якая дзейнічае ў законе, — адзначыла Наталля Качанава.

Грамадзян, якія прыйшлі на прыём, цікавілі пытанні ЖКГ, устаноўкі і абслугоўвання пад'ёмнікаў для людзей з інваліднасцю, працаўладкавання. Наталля Качанава таксама выслухала скаргі грамадзян наконт медыцынскага абслугоўвання, транспартнага паведамлення і якасці дарог. Падчас сустрэчы Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што пытанні сапраўды ёсць і іх дастаткова.

— Салігорск — даволі малады горад, і ў ім ёсць праблемы ў службе жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Мяркую, пытанні грамадзян па гэтай сферы вырашальныя. Некаторыя з іх адразу былі ўзяты на кантроль мясцовымі ўладамі. Ёсць пытанні, якія датычацца сістэмы аховы здароўя. Але адзначу, што ў горада вельмі моцная медыцынская база — работнікам неабходна звярнуць увагу на пытанні грамадзян. Некаторыя аспекты ўжо былі абмеркаваны з міністрам аховы здароўя, таму пытанні будуць вырашаны аператыўна, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава таксама звярнула ўвагу на тое, што былі ўзнятыя і праблемы сем'яў, дзе ёсць дзеці з інваліднасцю:

— Пасля даручэння Прэзідэнта шматдзетныя сем'і атрымалі запрашэнне на будаўніцтва кватэр або атрымалі зямельныя ўчасткі. Зараз нам неабходна скіраваць асаблівую ўвагу на вылучэнне жылля сем'ям з дзецьмі-інвалідамі.

Арына КАРПОВІЧ.

Больш падрабязна аб прыёме грамадзян у Салігорску і аб выніках адзінага дня прыёму на Міншчыне мы раскажам у наступным нумары «Мясцовага самакіравання».

Актуальны каментарый

Пакуль мы адзіныя — мы непераможныя!

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

— Замежныя сродкі масавай інфармацыі, інтэрнэт проста «гудуць» ад чарговага ўсплёску мілітарысцкай актыўнасці палітычных дзеячаў. На поўным сур'ёзе абмяркоўваецца магчымасць нанясення ядзерных удараў і прагназуюцца іх наступствы, ажыццяўляецца рэвізія вайсковых арсеналаў і запускаюцца ваенныя вытворчасці, нарошчваюцца групоўкі войскаў і вядзецца псіхалагічная апрацоўка насельніцтва.

У гэтых умовах пытанні забеспячэння бяспекі, узнятыя Прэзідэнтам нашай краіны Аляксандрам Лукашэнкам на нарадзе з кіраўнікамі ваеннай арганізацыі дзяржавы, — надзённая неабходнасць. Ваяўнічая рыторыка заходніх дзяржаў у адрас Беларусі, небывалы раней санкцыйны ціск, правакацыі на граніцах, спробы дэстабілізаваць абстаноўку ў краіне накіраваны на раскол нашага грамадства і змяненне палітычнага курсу.

Захаду не патрэбная моцная і незалежная дзяржава ў цэнтры Еўропы, якая адстойвае ўласныя правы. Неабходны чарговы васал, які выконвае любое пажаданне гаспадара, не лічачыся з інтарэсамі народа. Інфармацыйна-псіхалагічны ціск, падмена паняццяў, дэградацыя маральнасці, фарміраванне віртуальнай рэальнасці, культ індывідуалізму, прапаганда ўласных каштоўнасцяў — усё гэта інструменты расхістання асноў дзяржаўнасці. Яны выкарыстоўваюцца ў комплексе з эканамічнымі, палітычнымі і ваеннымі сродкамі, аб'яднанымі агульным паняццем «каляровая рэвалюцыя».

Беларусь — практычна адзіная краіна, у якой не спрацаваў універсальны сцэнарый Захаду. Мы вытрымалі, захавалі ўласную дзяржаўнасць і гатовыя яе абараняць усімі даступнымі сродкамі. Для гэтага ў нас ёсць надзейныя саюзнікі, сучасная армія, згуртаваны народ і моцны лідар нацыі. Беларусь заўсёды адкрытая для раўнапраўнага дыялогу, але не прымае дыктату.

Ва ўмовах фарміравання шматпалярнага свету менавіта дыялог павінен стаць асновай міждзяржаўных адносін. Тым жа, хто гэтаму пярэчыць і ў чарговы раз робіць стаўку на сілу, варта нагадаць словы А. Эйнштэйна: «Я не ведаю, якой зброяй будуць ваяваць у трэцяй сусветнай вайне, але ў чацвёртай будуць ваяваць палкамі і камянямі».

Па сутнасці

КРЫНІЦА ВЕДАЎ

Веды — гэта скарб. Мусіць, тая самая папараць-кветка. А яшчэ веды — магчымасць стаць лепшымі, больш разважлівымі, нават добрымі. У мяне няма сумнення, што менавіта ад дзеяслова «знаць» (па-руску «знать») утварылася найменне прывілеяванага саслоўя «знаць». Насамрэч раней веды, адукацыя для беларусаў былі нечым недасягальным. Вочы хамаў павінны былі глядзець выключна ў зямлю, у свіныя карыты, у падлогу — куды заўгодна, але толькі не ў падручнікі. Дарэчы, любыя разважанні і ўхваленні пэўнага гістарычнага перыяду нашай краіны, знаходжанне нашых земляў у складзе іншых дзяржаў вельмі лёгка ацаніць. Па колькасці вядомых у той час беларусаў — ад інжынера да паэта. Вядомыя асобы і ёсць паказчык развіцця грамадства. Ну і калі беларусы са згорбленых, нібы сляне перад панамі, хат з саламянымі стрэхамі, з земляной падлогай, здолелі ўзняцца да вяршынь космасу і міжнароднай дыпламатыі? Правільна. Адназначны адказ — падчас увядзення агульнай адукацыі ў БССР. У той час у грамадстве прага да ведаў назапасілася, нібыта смага ў час ліпеньскага сенакосу. Цяпер наталілі яе. Нават занадта. Ды так, што патрэбная інфармацыя ўжо не ўмяшчаецца ў галаву чалавека, атручаная і разбэшчанага бруднымі ведамі. Для чаго тую колішнюю прагу да ведаў я параўнаў са смагай? Каб засяродзіць увагу на некаторых тэндэнцыях у адукацыі. Крыніцу ведаў проста забрудзілі. Няма ўжо трапяткога, узрушанага стаўлення да кнігі, на тумбачках каля ложка часцей не яна — тэлевізійны пульт альбо смартфон. На жаль, няма і той колішняй павагі да Настаўніка.

Зноў рэформы — «па-заходняму». Нават адукацыю намагаліся ператварыць у сферу аказання паслуг. Добра, што спыніліся. А малады міністр, нібыта той коласаўскі Лабановіч, стаіць на ростанях. На скрыжаванні... Як улічыць сучасныя запыты грамадства і неабходнасць выхавання па-дзяржаўнаму? Культ «мне ўсе павінны» трапіў і ў стаўленне да адукацыі. Яе ператварылі ў тавар. Як на Захадзе. Прыватныя школы. Добра, так і атрымалася — як на Захадзе. Але ж зусім нядобра. Дзеці з прыватных школ пачалі страляць адзін у аднаго. Гэта не здарэнне, гэта ўжо з'ява. Дзіцячы крык аб дапамозе: звярніце на нас увагу. Вось вам і індывідуальны падыход да дзіцяці ў прыватных школах. Псіхолагі, асаблівыя заняткі, вельмі паважлівае стаўленне да бацькоў... Так, за такую павагу добрую «рэнту» ўносілі. А калі б у агульнаадукацыйнай установе прапанавалі колькі рублёў сабраць — такі б вэрхал падняўся. А плаціць за «альтэрнатыўную рэчаіснасць» гатовыя. Адчуванне, нібы дарослыя бацькі нырнулі ў віртуальны свет ды там і засталіся. Гуляюць. Дарэчы, паслугай прыватных школ менавіта ў асноўным сем'і айцішнікаў і карысталіся.

Нават простыя патрабаванні — атрымаць абавязковую акрэдытацыю — адміністрацыі прыватных школ праігнаравалі. А навошта? «Альтэрнатыўная рэчаіснасць». Атрымліваецца, дарослыя вялі сваіх дзяцей не ў школы, а ў лакацыі для баўлення часу. Бо без акрэдытацыі нельга выдаць атэстат. І самае галоўнае — гэтыя парадыйныя прасторы набыцця «ведаў» не прайшлі інспекцыю па бяспецы. Бацькі плацілі грошы за тое, што іх дзеці кожны дзень знаходзяцца ў незразумелых умовах. І гэта сотні беларусаў.

А пасля закрыцця тых неадназначных «адукацыйных» лакацый бацькі яшчэ і абураюцца. Маўляў, дзяржаўныя школы ў пешай даступнасці перапоўненыя. Так, гэтае пытанне трэба вырашаць. Бо хапае школ і недаўкамплектаваных. Але... Калі вазілі ў прыватную, чаму б не адвезці і ў агульнаадукацыйную? Нават і школьныя аўтобусы можна арганізаваць. У рэгіёнах такая практыка дзейнічае. Але скажу пра асабістае. Мая дарога да ведаў была чатыры кіламетры ў адзін бок і, вядома, столькі ж у другі — «васьмёрка» штодня.

А вось куды б завялі гэтыя прыватныя школы новае пакаленне? Яскрава навучальны працэс ахарактарызаваў адзін з бацькоў. Сярод плюсоў, маўляў: замест цяжкіх тэм на занятках абмяркоўвалі... міжнародныя справы, а замест нуднага чытання вывучалі... «Гары Потэра». Уяўляеце?! Замест трылогіі Коласа — патэрыяна. Неверагоднасць у дзеянні. Вельмі вялікае пытанне: каго рыхтавалі з нашых дзяцей за грошы іх бацькоў? Знаўцаў «Гары Потэра», амататараў заходняга ўкладу жыцця? Нават прайшла інфармацыя, што займаліся дзеці... акультнымі практыкамі. У агульнаадукацыйных школах вельмі асцярожна ставяцца нават да факультатываў «па асновах маральнасці». А ў прыватных — акультызм. Цяпер я разумею, чаму там праігнаравалі працэдуру акрэдытацыі: з такой навучальнай праграмай не прайшлі б. Бо там галоўнае — не веды, галоўнае — падабацца. Ну, плацяць жа. Не адукацыйная школа, а суцэльнае «фэнтэзі». А пасля такіх адукацыйных эксперыментаў выпускнікі «альтэрнатыўнай рэчаіснасці», дарэчы, без атэстатаў, пайшлі б патрабаваць «пэрамэнаў». Ужо не ва ўтульнай лакацыі, а на сапраўдных вуліцах.

Ведаеце, я спачуваю настаўнікам, якія будуць навучаць дзяцей, выцягнутых з багны прыватнай адукацыі. Цяжкая сацыялізацыя, асаблівыя веды і патрабаванне асабістага стаўлення. Нават дыягназ прыдумалі — востры дэфіцыт увагі. Прабачце, паступова вылечваюць — ужо пільна і ўважліва падышлі да прыватнай адукацыі. Як той казаў, запоўнілі гэты дэфіцыт увагі на рынку ведаў. На мой погляд, школьнымі ведамі нельга гандляваць, а тым больш пад шыльдамі прыватных крамак з іншамоўнымі назвамі. Гэта ганьба нават не адукацыі, гэта вельмі нагадвае палітыку неаколаніялізму. Калі на паліцах крамы «USA» раскладзены суверэнітэты іншых краін. І яны яшчэ за гэта плацяць. І ці не пачыналася ўсё з атручвання крыніцы ведаў?..

Яўген ПУСТАВОЙ.

Акцыя

На стаматалагічны агляд — у «Сталіцу»

Кожны наведвальнік гандлёвага цэнтра 7 кастрычніка зможа бясплатна атрымаць кансультацыю стаматолага

Заўтра ўсе наведвальнікі гандлёвага цэнтра «Сталіца» змогуць бясплатна прайсці прафілактычны агляд у стаматолагаў і атрымаць кансультацыю па доглядзе за зубамі. Тут стартуе дабрачынная акцыя «З усмешкай у мірную будучыню», арганізаваная Мінскім гарадскім дзіцячым клінічным цэнтрам па стаматалогіі. Мерапрыемствы накіраваны на прафілактыку стаматалагічных захворванняў, папулярызацыю беларускай прадукцыі і вытворцаў тавараў стаматалагічнай накіраванасці.

Гандлёвы цэнтр «Сталіца» невыпадкова абраны месцам правядзення акцыі, бо ён, паводле распараджэння кіраўніка дзяржавы, мусіць стаць месцам найлепшых брэндаў, дасягненняў, тавараў паходжаннем з Беларусі. Усе яго наведвальнікі падчас акцыі змогуць прайсці агляд ва ўрачоў-стаматолагаў, атрымаць кансультацыю, стаць удзельнікам прэзентацый стаматалагічнай прадукцыі — зубных шчотак, пастаў, апаласквальнікаў. Таксама наведвальнікаў чакаюць інтэрактыўныя конкурсы і віктарыны па здаровым ладзе жыцця і прафілактыцы стаматалагічных захворванняў.

Прафесіяналам будуць цікавыя стаматалагічнае абсталяванне, касметычныя і гігіенічныя сродкі, выраблены ў Беларусі, якія пасля будуць прадстаўлены ў магазінах гандлёвага цэнтра. У прыватнасці, РУП «Медтэхнацэнтр» прадставіць медыцынскую мэблю і стаматалагічнае крэсла беларускай вытворчасці.

Акцыя працягнецца ў кастрычніку і лістападзе. Стаматолагі наведаюць інтэрнатныя ўстановы, у тым ліку для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Спецыялісты Мінскага гарадскога дзіцячага клінічнага цэнтра па стаматалогіі арганізуюць для малых асветніцка-забаўляльную праграму з інтэрактыўным навучаннем па пытаннях здаровага ладу жыцця і прафілактыцы стаматалагічных хвароб. У мерапрыемствах возьме ўдзел і «Школа міру» пад патранажам грамадскай арганізацыі «Беларускі фонд міру».

У рамках акцыі запланавана наведаць Дзіцячы дом № 3 г. Мінска, Дзіцячы дом № 7 «Семь Я» г. Мінска, Дзіцячы гарадок Ленінскага раёна г. Мінска, Дзіцячы дом № 5 г. Мінска, Дапаможную школу-інтэрнат № 10 г. Мінска.

Акцыя «З усмешкай у мірную будучыню» прымеркавана да 70-гадовага юбілею Мінскага гарадскога дзіцячага клінічнага цэнтра па стаматалогіі.

Алена КРАВЕЦ.

Добрая навіна

НА ВУЧОБУ Ў ПРЫГАРАД — БЯСПЛАТНА!

Навучэнцы школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Мінскага раёна, якія жывуць у сталіцы, могуць бясплатна дабірацца на вучобу на грамадскім аўтамабільным транспарце. Такое рашэнне прыняў Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў.

Бясплатны праезд з 1 верасня да 30 чэрвеня ў прыгарадным транспарце даецца на падставе рашэння № 425 ад 23 верасня. У дакументе ўдакладняецца, што без аплаты можна карыстацца грамадскім транспартам, які ажыццяўляе прыгарадныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах.

Нагадаем, у Мінску навучэнцы школ і гімназій могуць бясплатна перамяшчацца на гарадскім грамадскім транспарце, гарадскім электратранспарце і метро. Пры гэтым школьнік павінен браць з сабой у паездку даведку, якая пацвярджае, што ён з'яўляецца навучэнцам пэўнай навучальнай установы. У даведцы ўказваюць месца жыхарства і месца вучобы, а таксама ўзровень адукацыі або від адукацыйнай праграмы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

БЕРАЖЫЦЕ БАЦЬКОЎ

Дзеці і ратавальнікі дапамагаюць пажылым людзям навесці парадак. Пры гэтым не забываюць нагадваць ім аб правілах бяспекі.

АГУЛЬНАЯ СПРАВА

Апошнім часам падрастаючае пакаленне стала правай рукой прапагандыстаў МНС падчас правядзення шматлікіх мерапрыемстваў па фарміраванні культуры бяспекі жыццядзейнасці. Выключэннем не стала і рэспубліканская акцыя «Моладзь за бяспеку», якая праводзіцца Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях з 3 да 14 кастрычніка. На дзяцей і падлеткаў ускладзена надзвычай важная місія — павышаць узровень ведаў грамадскасці ў галіне бяспечнай жыццядзейнасці і аказаць пасільную дапамогу тым, хто ў гэтым мае патрэбу, — перш за ўсё, гаворка ідзе пра пажылых людзей.

Маладзёжны дэсант наведвае пенсіянераў, інвалідаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, дапамагае ім па гаспадарцы. Хлопцы і дзяўчаты прыбіраюць у хатах пажылых людзей, наводзяць парадак на прысядзібнай тэрыторыі, збіраюць ураджай, нарыхтоўваюць дровы… У абавязковым парадку юныя ратавальнікі правяраюць жыллё адзінокіх гаспадароў на наяўнасць аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў. Пры іх адсутнасці — устанаўліваюць гэты важны прыбор, які ў надзвычайнай сітуацыі выратуе жыццё. Разам са школьнікамі дапамагаюць пенсіянерам прадстаўнікі тэрытарыяльных падраздзяленняў Чырвонага Крыжа, Беларускага добраахвотнага пажарнага таварыства, а таксама студэнты.

У прыватнасці, днямі юныя ратавальнікі завіталі да пажылой жанчыны са Старадарожскага раёна, якая жыве адна. Алене Тарнецкай ужо не па сілах самастойна прыбраць у дварыапалае лісце, не змагла яна ўскапаць і градку. Школьнікі з пастаўленай задачай справіліся хутка і весела — кампанія сабралася дружная. Дапамаглі пажылой жанчыне і сабраць ураджай. Работы хапіла ўсім. Аднак стаміцца ніхто не паспеў. Прыклаўшы мінімум намаганняў, дзеці зрабілі вялікую справу.

— Я вельмі рада, што яны заглянулі да мяне, — прызналася пенсіянерка. — Сілы і здароўе ўжо не тыя. Гэтай работы мне хапіла б да зімы, а школьнікі ўсё за некалькі гадзін зрабілі. Вось што значыць маладосць!

Алена Альфонсаўна падзякавала сваім памочнікам — запрасіла іх на гарбату і дэгустацыю сабранага ўраджаю.

ПРАВЕРЫЦЬ ПЕЧ І ПАЖАРНЫ АПАВЯШЧАЛЬНІК

Падчас працоўных дэсантаў моладзі да пажылых людзей апошнім прапаноўваецца ўзяць удзел у здымках ролікаў на тэму «Бабуліны рэцэпты бяспекі». Вядома, рэцэпты — гэта добра, але мэта ў іншым: гатуючы тую ці іншую страву разам з пажылым чалавекам, юныя ратавальнікі адначасова расказваюць яму аб тым, якія ўмовы павінны быць створаны для бяспечнага прыгатавання ежы. Напрыклад, гатуюць бабку са шкваркамі — згадваюць «рэцэпт» бяспечнай печы: вычышчаны ад сажы і пабелены комін, наяўнасць ахоўнага ліста перад топкай, адсутнасць на печы расколін і іншае. Такое ўзаемадзеянне дае свой эфект: пажылыя людзі не проста весела праводзяць час з маладым пакаленнем, а ў чарговы раз звяртаюць увагу на бяспечныя ўмовы ўтрымання свайго жылля.

Аб чым пенсіянерам патрэбна задумацца ў першую чаргу? У доме з пячным ацяпленнем — аб цэласнасці сваёй печы. Ніякіх расколін і сколаў — ні ў кладцы, ні ў коміне. Апошні абавязкова павінен быць атынкаваны і пабелены. Побач з топкай печы неабходна прыбіць металічны ліст памерам 50 на 70 сантыметраў.

— Яшчэ адна важная парада: у пажылых людзей у хаце, у кожным жылым пакоі, трэба ўстанавіць аўтаномны пажарны апавяшчальнік, каб у выпадку пажару ён своечасова апавясціў гаспадароў аб небяспецы, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Гэты недарагі прыбор можа выратаваць самае каштоўнае, што ёсць у кожнага чалавека, — жыццё. Калі апавяшчальнікі ўстаноўлены, варта сачыць, каб у іх рэгулярна праводзілася замена элемента харчавання.

У старых хатах часта і электраправодка не новая. Калі ў гэтым ёсць неабходнасць, абавязкова папрасіце дапамогі ў спецыялістаў яе памяняць. Усе разеткі, сеткавыя кабелі, электрапрыборы павінны быць спраўныя. Не лішнім будзе нагадаць пажылым людзям, што на ноч усе прыборы патрэбна выключаць з разеткі.

Звяртаць сваю ўвагу пенсіянеры (гэта, дарэчы, датычыцца не толькі іх) павінны не толькі на тое, што ў доме, а і на абстаноўку па-за ім. Двор не павінен быць захламлены. Смецце, сена, салому ні ў якім разе нельга скідваць побач з гаспадарчымі пабудовамі — у выпадку ўзгарання яны ўспыхнуць, як запалкі. Калі пажылы чалавек або той, хто вырашыў яму дапамагчы, плануе пазбавіцца ад смецця, спаліўшы яго, варта памятаць, што рабіць тое неабходна выключна ў бязветранае надвор'е, прычым падалей ад будынкаў і пабудоў. Пры гэтым пад рукой павінны быць першасныя сродкі пажаратушэння. Калі ўжо распалілі агонь, то ажыццяўляйце за ім пастаянны кантроль — да поўнага спынення тлення.

Ратавальнікі рэкамендуюць зрабіць сваім пажылым бацькам, бабулям і дзядулям, проста знаёмым пенсіянерам, якія пражываюць адны, картку-напамін з тэлефонамі нумароў службаў экстранага выкліку. Яе лепш прымацаваць каля стацыянарнага тэлефона або пакласці на стол пад шкло. Адным словам, дапамажыце пажылым людзям, асабліва адзінокім, падрыхтавацца да непрадбачаных сітуацый. І самае галоўнае, не адкладвайце дапамогу на заўтра, каб не было позна.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы абласнога ўпраўлення МНС.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Савеце Бяспекі РФ назвалі вінаватага ў спыненні перагавораў Масквы і Кіева

Сакратар Савета Бяспекі Расіі Мікалай Патрушаў абвінаваціў ЗША ў зрыве ўсіх спроб перагаварaў Расіі і Украіны па ўрэгуляванні канфлікту. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны».

Патрушаў адзначыў, што Вашынгтон параіў Кіеву адмовіцца ад перагавораў. «Усе спробы перагаворнага працэсу былі сарваныя па загадзе амерыканскіх апекуноў кіеўскага рэжыму», — сказаў ён. Сакратар Савета Бяспекі РФ падкрэсліў, што Злучаныя Штаты і іх заходнія саюзнікі маюць намер весці баявыя дзеянні «да апошняга ўкраінца».

На яго думку, народ Украіны для ЗША і еўрапейскіх краін з'яўляецца «разменнай манетай у геапалітычнай гульні». Расія ж, адзначыў ён, наадварот, зацікаўлена ў тым, каб украінскія грамадзяне жылі ва ўмовах міру.

Раней Мікалай Патрушаў заявіў, што супраць Расіі «ваюе блок НАТА». Ён адзначыў, што краіны Паўночнаатлантычнага альянсу даюць кіеўскаму рэжыму цяжкае ўзбраенне, боепрыпасы, разведданыя, а таксама забяспечваюць падрыхтоўку ваенных спецыялістаў.

FP: Чэхія і Славакія могуць адмовіцца ад падтрымкі Украіны з-за росту цэн на газ

Аглядальнік часопіса Foreign Policy Цім Гослінг лічыць, што праз некаторы час Чэхія і Славакія, магчыма, адмовяцца ад падтрымкі Украіны з-за перспектывы ўзрушэнняў ва ўнутранай палітыцы на фоне росту цэн на энергарэсурсы.

Журналіст сцвярджае, што Усходняя Еўропа больш схільная да рызыкі з-за ніжэйшага, чым у краінах Заходняй Еўропы, эканамічнага развіцця і высокай залежнасці ад расійскіх паставак. У артыкуле гаворыцца, што ў 2021 годзе на долю газу, які пастаўляецца з РФ, прыходзілася 55 % ад агульнага спажывання ў Чэхіі і 68 % — у Славакіі.

«Яны рызыкуюць сутыкнуцца з унутрыпалітычнай нестабільнасцю з-за росту цэн і страху дэфіцыту запасаў зімой. Ёсць рызыка, што гэта можа аслабіць іх падтрымку Украіны», — адзначаецца ў публікацыі.

Гослінг выказаў здагадку, што да ўлады ў гэтых краінах, магчыма, прыйдуць прарасійскія партыі, якія, па словах аглядальніка, могуць «скарыстацца» страхам мясцовых жыхароў — людзі баяцца пазбавіцца магчымасці плаціць за ацяпленне сваёй жылплошчы.

Тым часам доля расійскага газу ў сукупным аб'ёме паставак у Еўропу скараціласа да 7,5 працэнта. Пра гэта на пленарнай сесіі Еўрапарламента заявіла кіраўнік Еўрапейскай камісіі Урсула фон дэр Ляен. «Да спецаперацыі ва Украіне доля Расіі ў пастаўках была на ўзроўні 41 %. Цяпер гэты паказчык складае 7,5 %», — адзначыла фон дэр Ляен.

Дзярждоўг ЗША перавысіў $31 трыльён упершыню ў гісторыі дзяржавы

Дзяржаўны доўг ЗША перавысіў адзнаку ў $31 трлн, дасягнуўшы рэкорднага паказчыка, паведамляе ТАСС са спасылкай на Мінфін ЗША.

Па стане на 3 кастрычніка, сукупны дзярждоўг ЗША складае $31,123 трлн. Як адзначыў аглядальнік газеты The New York Times, такая рэкордная лічба была дасягнута ў «непрыдатны момант». Ва ўмовах цяперашняй эканамічнай сітуацыі ў ЗША высокія працэнтныя стаўкі ў доўгатэрміновай перспектыве робяць абслугоўванне доўгу яшчэ даражэйшым.

ІНДЭКС НЯШЧАСЦЯ

Што чакае літоўцаў?

Прыбалтыйская «тройка» зноў у сумных лідарах у Еўрапейскім саюзе па ўзроўні інфляцыі. Аб гэтым сведчаць свежыя даныя статыстычнага агенцтва Eurostat. Паводле яго інфармацыі, спажывецкія цэны ў еўразоне ў верасні ў сярэднім узраслі на рэкордныя 10 працэнтаў. Пры гэтым у прыбалтыйскіх краінах узровень інфляцыі больш чым удвая перасягнуў дадзены паказчык. У Эстоніі цэны ўзраслі на 24,2 працэнта, у Літве — на 22,5, у Латвіі — на 22,4 працэнта. Імклівае разгортванне інфляцыі эксперты агенцтва Eurostat звязваюць у першую чаргу з падарожаннем энерганосьбітаў, а таксама прадуктаў харчавання, прамысловых тавараў і паслуг. У параўнанні са жніўнем у верасні рост цэн набраў найбольшую хуткасць у Літве — 2,8 працэнта (для параўнання: у Эстоніі за гэты час цэны павялічыліся на 0,4 працэнта). На думку галоўнага эканаміста банка Luminor Жыгімантаса Маўрыцаса, над эканомікай гэтай прыбалтыйскай краіны навісаюць хмары — узрастае верагоднасць апускання ў рэцэсію, якая будзе больш працяглай і глыбейшай, чым падчас пандэміі COVID-19, паведаміў kurier.lt. Аднак належных мер улады не прымаюць, у такой сітуацыі жыхары блізкія да панікі, асабліва на фоне набліжэння халадоў. Што ж чакае літоўцаў?

Канцы з канцамі

Старшыня Сацыял-дэмакратычнай партыі Вілія Блінкявічутэ навалілася з рэзкай крытыкай у адрас літоўскіх уладаў. Паводле яе слоў, прыбалтыйскую краіну чакаюць галодныя часы, аднак урад працягвае бяздзейнічаць, паведамляе Baltnews. Па словах Блінкявічутэ, апазіцыйныя дэпутаты неаднаразова накіроўвалі ва ўрад прапановы па рэгуляванні інфляцыі ў краіне і дапамозе насельніцтву, аднак улады кожны раз адхілялі дадзеныя ініцыятывы, спасылаючыся на недахоп грошай у бюджэце.

«Грошай ніколі не будзе дастаткова: ні ў дрэнныя, ні ў добрыя часы. Ёсць прыярытэты, а прыярытэт цяпер — гэта чалавек, што жыве ў Літве, які атрымлівае недастатковыя даходы, калі цэны ўзраслі ў тры-чатыры разы», — заявіла Блінкявічутэ. Дэпутат падкрэсліла, што абавязкам урада з'яўляецца абарона грамадзян ад голаду, і абмежаванасць бюджэту не можа быць апраўданнем у неабходнай ўладаў дапамагаць людзям. «Урад абавязаны знайсці рашэнні, каб чалавек у Літве не паміраў ад голаду, каб моладзь не эмігравала», — заявіла Блінкявічутэ.

Тым часам, пакуль літоўскія ўлады і апазіцыя высвятляюць адносіны, грамадзяне краіны спрабуюць звесці канцы з канцамі. Паводле Baltnews, з ростам цэн у Літве не спраўляюцца не толькі грамадзяне з нізкімі прыбыткамі, але і сярэдні клас. Гэта добра відаць, калі падлічыць колькасць заявак ад літоўцаў на выдзяленне кампенсацыі за ацяпленне, а таксама за гарачую і халодную ваду. Для атрымання падобнай кампенсацыі неабходна звярнуцца ў мясцовыя муніцыпалітэты. Па словах прадстаўніка Панявежскага муніцыпалітэта Вілмы Раткявічутэ, калі раней на кампенсацыю ў асноўным прыходзілі пенсіянеры і шматдзетныя сем'і, то цяпер просьбы аб дапамозе паступаюць і ад іншых катэгорый грамадзян. У апошні час заяўкі на атрыманне кампенсацыі прыносіць каля 100 чалавек за дзень.

Аналагічная сітуацыя назіраецца і ў іншым літоўскім горадзе — Шаўляі. Па словах прадстаўніка гарадскіх уладаў Аўшры Гайлюненэ, ацяпляльны сезон не паспеў пачацца, а муніцыпалітэт ужо атрымлівае заявы на аказанне дапамогі ад 300-400 чалавек у дзень.

З такімі ж праблемамі сутыкнуліся ў Каўнаскім муніцыпалітэце. «Ужо цяпер звяртаецца нямала людзей. У кожным старостве мы прымаем больш чым па 100 чалавек у дзень, адказваем на 300 званкоў. Летась у гэты час паступіла 697 заявак, а цяпер — 2058», — распавяла супрацоўнік муніцыпалітэта Эрыка Качуленэ. У сталічным Вільнюскім муніцыпалітэце штодзень разглядаецца каля 500 заяў на аказанне дапамогі. У параўнанні з вераснем 2021-га колькасць зваротаў павялічылася на 400 працэнтаў.

Як паведаміў літоўскі партал Delfi, сёлета Літва аказалася сярод краін, якія перажываюць найбольшыя эканамічныя цяжкасці. Так, паводле звестак Літоўскага інстытута свабоднага рынку, у першым квартале бягучага года яна размясцілася на пятым месцы ў Індэксе няшчасця (Misery index) — спісе дзяржаў, якія адчуваюць найбольшыя эканамічныя цяжкасці. «Аналізуючы паказчыкі Індэкса няшчасця: інфляцыю, рост валавога ўнутранага прадукту і ўзровень беспрацоўя, мы адзначаем, што менавіта рэкордны рост цэн аказаў найбольшы ўплыў на эканамічную сітуацыю, — заўважыла прадстаўнік інстытута Котрына Тамкуцэ. — Аднак самае балючае заключаецца ў тым, што з-за надзвычай высокага росту цэн і вялікай нявызначанасці грошы губляюць сваю каштоўнасць і не могуць служыць сродкам збяражэння. І жыхарам, і кампаніям становіцца ўсё цяжэй прагназаваць свае выдаткі і прыбыткі, інвеставаць».

Хваля банкруцтваў

У Літве сёлета ў першым паўгоддзі колькасць прадпрыемстваў, якія распачалі працэдуру банкруцтва, узрасла ў 1,7 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Аб гэтым паведаміла Delfi са спасылкай на даныя Дэпартамента статыстыкі Літвы. Адзначаецца, што ў першым квартале бягучага года працэдуру банкруцтва ініцыіравалі 312 прадпрыемстваў,

а ў другім — 274. Пры гэтым больш за ўсё банкруцтваў ініцыіравалі прадпрыемствы будаўнічага сектара (137 супраць 57 летась). Таксама амаль удвая павялічылася колькасць банкруцтваў у сектары аптовага і рознічнага гандлю, гаспадарчых суб'ектаў, якія прадстаўляюць паслугі па рамонце транспартных сродкаў і матацыклаў.

Падобная сітуацыя складваецца і ў сферы аказання паслуг размяшчэння і харчавання. Так, сёлета ў студзені—чэрвені збанкрутаваўся 61 пастаўшчык гэтых паслуг, у той час як летась — 33. У галіне апрацоўчай вытворчасці працэдуры банкруцтва распачалі 53 прадпрыемствы, у першым паўгоддзі мінулага года — 35. Больш за ўсё распачатых працэдур банкруцтва было зафіксавана ў Вільнюскім павеце (271), Каўнаскім (121) і Клайпедскім (83).

У паведамленні Дэпартамента статыстыкі Літвы згадваецца аб апасеннях эканамістаў і арганізацый, якія абараняюць інтарэсы бізнесу, наконт таго, што без падтрымкі дзяржавы колькасць прадпрыемстваў-банкрутаў будзе толькі павялічвацца. Па словах эканаміста з Swedbank Нерыюса Мачуліса, найбольш відавочнай прычынай сітуацыі, якая склалася, з'яўляюцца ўзрослыя выдаткі на электраэнергію.

У Літве можа скласціся тэндэнцыя па спыненні прадпрыемстваў з-за росту цэн на электраэнергію. Пра гэта папярэдзіў кіраўнік Канфедэрацыі бізнесу Літвы Андрус Раманоўскіс, паведаміла Delfi. Паводле яго слоў, прадпрыемствы, якія спыняюць або ўжо спынілі работу, цяпер можна знайсці ў кожным самакіраванні Літвы і іх колькасць расце. «Відавочна, што пасля атрымання першых касмічных рахункаў бізнес прымае меры па зніжэнні расходаў і неяк спрабуе выжыць у такой сітуацыі», — сказаў Андрус Раманоўскіс. Ён нагадаў аб прыпыненні з-за высокіх цэн на газ найбуйнейшага ў Прыбалтыцы завода па вытворчасці азотных угнаенняў Achema, які знаходзіцца ў Літве. «Думаю, што прыклад Achema сімптаматычны. Ён паказвае, якім шляхам ідуць або пойдуць іншыя прадпрыемствы», — канстатаваў кіраўнік Канфедэрацыі бізнесу Літвы.

Няма на чым эканоміць

Старшыня камітэта Сейма Літвы па сацыяльных пытаннях Міндоўг Лінгэ заявіў у тэлеэфіры, што жыхары ўсімі сіламі павінны эканоміць свае рэсурсы, піша Delfi.lt. Колішні прэм'ер-міністр Літвы Альгірдас Буткявічус лічыць, што ўрад ужо павінен быў прадставіць гэты план. «Што адбудзецца, калі ў грамадства не будзе канкрэтнай інфармацыі? Я не прапаную, каб пачаліся сацыяльныя беспарадкі. Але пікеты могуць пачацца толькі з-за невядомасці ў дзеяннях урада і парламента», — заўважыў Буткявічус.

Жыхары розных гарадоў Літвы распавялі журналістам тэлеканала LNK, што ім не патрэбныя заклікі ўладаў, бо яны эканомяць і без таго. Людзям важная рэальная падтрымка ў гэтай складанай сітуацыі. «Эканомлю, муж памёр... Хочаш — не хочаш, а эканоміць трэба. Выключаем усё, цяпер так выпадае жыць», — сказала жыхарка Вільнюса. Жыхарка Панявежыса перадала LNK: «Эканомлю так, што далей няма куды. Нам ужо, ведаеце, няма на чым больш эканоміць». Іншая жанчына з абурэннем адзначыла: «Да эканоміі заклікаюць тыя, хто самі ніколі не эканомілі. Я так разумею».

78 працэнтаў жыхароў Літвы лічаць, што апошнім часам эканамічнае становішча краіны пагоршылася, паведаміў партал Delfi. Апытанне праводзіла кампанія Baltijos tyrimai. «Большая частка жыхароў лічыць, што эканоміка пагаршаецца, і вельмі дрэнна ацэньвае сваё фінансавае становішча, — адзначыла эканаміст Swedbank Юрацэ Цвілікенэ. — Інфляцыя ў нас рэкордная. Няма такіх людзей, якія не адчуваюць рост цэн».

Дырэктар Нацыянальнай сеткі арганізацый па зніжэнні галечы Айстэ Адомавічэнэ звяртае ўвагу на тое, што ў больш чым трэці жыхароў няма збяражэнняў. «Згодна з падлікамі, у 36 працэнтаў жыхароў Літвы няма сродкаў на выпадак непрадбачаных выдаткаў. Гэтыя людзі жывуць ад заробку да заробку. У іх проста няма грошай, якія можна было б адкласці. Гэтыя людзі адчувальныя да любога падаражання тавараў і паслуг. Таксама ёсць нямала людзей з вельмі невялікімі даходамі: пенсіянеры, інваліды», — адзначыла Адомавічэнэ. Яна нагадала, што ў 2018 годзе «энергетычную галечу» адчувалі 28 працэнтаў жыхароў Літвы. «На жаль, сёння ёсць апасенні, што з энергетычнай галечай сутыкнецца больш людзей, ім будзе складаней аплаціць рахункі», — падкрэсліла Адомавічэнэ. Яна дадала, што «частка людзей насамрэч мае патрэбу ў больш інтэнсіўнай дапамозе, чым да гэтага часу — асабліва з улікам агульнага маштабу інфляцыі».

Дырэктар дабрачыннай арганізацыі «Харчовы банк» Сіманас Гуравічус прызнаў, што з ліпеня-жніўня адчуваецца: людзям стала больш складана. «У сярэднім мы цяпер аказваем дапамогу 170 тысячам чалавек. Паступае ўсё больш просьбаў аказаць дапамогу прадуктамі. Штомесяц колькасць людзей, якія жывуць у нястачы, павялічваецца на тысячу. Калі б у нас было больш ежы, мы б сапраўды дапаможам большай колькасці людзей», — сказаў Гуравічус.

Тым часам стала вядома, што налета ваенны бюджэт Літвы амаль удвая перасягне адпаведныя расходы сёлета. Пра гэта заявіў міністр абароны прыбалтыйскай рэспублікі Арвідас Анушаўскас у эфіры LRT. У дадзеным кантэксце зусім не дзіўным выглядае зніжэнне даверу да ўрада Літвы. Такія даныя апытання, праведзенага на заказе Delfi кампаніяй Spinter tyrimai. Доўгатэрміновыя тэндэнцыі паказваюць змену рэйтынгу не толькі кабінета міністраў, але і яго кіраўніка Інгрыды Шыманітэ. Палітолагі адзначылі Delfi, што найбліжэйшыя восеньскія месяцы толькі пагоршаць рэйтынгі ўрада. У людзей не засталося ілюзій наконт літоўскіх уладаў, якія могуць хіба падняць краіну на вядучыя пазіцыі ў індэксе няшчасця, а таксама разгортваць інфляцыю і гонку ўзбраенняў.

Пётр ДУНЬКО.

❍ Даслоўна

«ЗАМЕСТ ПАДТРЫМКІ НАСЕЛЬНІЦТВА ПАВЯЛІЧВАЮЦЬ ВАЕННЫ БЮДЖЭТ»

Захаду ўжо чвэрць стагоддзя перашкаджае палітыка, якую праводзіць Беларусь. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе па пытаннях ваеннай бяспекі.

«Да Беларусі ў калектыўнага Захаду свае разлікі. Прычым ужо даўно: чвэрць стагоддзя ім перашкаджае тая палітыка, якую мы праводзім», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Менавіта таму, падкрэсліў Прэзідэнт, у Еўропе захоўваецца 35-тысячная групоўка войскаў НАТА, з якой большая частка — амаль 25 тысяч — у суседніх з Беларуссю краінах.

«Не зніжаецца інтэнсіўнасць разведвальных палётаў паблізу нашых граніц. Актыўна праводзіцца аператыўная і баявая падрыхтоўка, у тым ліку з задзейнічаннем палігона «Пабрадэ» ў Літве, які знаходзіцца ўсяго за 15 кіламетраў ад Дзяржаўнай граніцы Беларусі. Адначасова пад выглядам падтрымкі Кіева шэраг еўрапейскіх краін рэалізоўвае свае планы па пераўзбраенні на сучасныя ўзоры ўзбраення і тэхнікі, узмацненне сваіх армій», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Найбольшую актыўнасць праяўляе Польшча, заўважыў кіраўнік дзяржавы. На поўдні беларускага напрамку адбываецца фарміраванне новай механізаванай дывізіі, на поўначы і ўсходзе краіны ствараюцца кадравыя брыгады тэрытарыяльнай абароны Польшчы. «Пашыраецца геаграфія закупак узбраенняў: да традыцыйных ЗША і Германіі дадалася Паўднёвая Карэя. Замест падтрымкі свайго насельніцтва ў складанай сацыяльна-эканамічнай абстаноўцы ўрад Польшчы плануе павялічыць свой ваенны бюджэт», — сказаў Прэзідэнт.

Спрабуюць не адставаць у мілітарысцкай гонцы, паводле яго слоў, Літва і Латвія. Але ўласных сродкаў у іх няма, таму просяць НАТА ўзмацніць прысутнасць на сваіх тэрыторыях за кошт разгортвання на месцы батальённых брыгадных баявых тактычных груп. «Пачалі будаўніцтва новых ваенных гарадкоў для іх размяшчэння на пастаяннай аснове, у тым ліку ў непасрэднай блізкасці ад нашай граніцы — за 20 кіламетраў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, Літва заявіла аб намерах набыць амерыканскія рэактыўныя сістэмы залпавага агню «Хаймарс». «Навошта яны ім, ваенным людзям, думаю, тлумачыць не трэба», — дадаў Прэзідэнт.

ЗЛАМАНЫ КАРАБЛІК

У нас дома сцяну ў вітальні ўпрыгожваюць караблікі з плоскага каменю. Дык вось нядаўна ніжняя частка аднаго з іх знікла. Тое, што каменьчыка няма, заўважыў муж. Ён адразу ж здагадаўся, чыіх гэта рук справа. «Сымон, гэта ты зрабіў?» — паклікаў трохгадовага сына. — «Не», — кажа той. — «А ты не ведаеш, куды каменьчык са сцяны падзеўся? Прызнайся. Калі гэта ты яго адарваў, я не буду злавацца. Абяцаю». Пасля гэтых слоў Сымон дастаў частку карабліка... са свайго гумовага боціка... Цяпер вельмі часта, калі штосьці ламаецца, малы кажа: «Секундачку, зараз я паклічу тату і пакажу яму. Ён абяцаў, што не будзе злавацца».

...У той вечар муж паехаў па справах у горад. Мы з сынам засталіся дома ўдваіх. Пакуль Сымон на кухні глядзеў «Калыханку», я вырашыла падняцца на мансарду і крыху папрацаваць за камп'ютарам. Праз дваццаць хвілін пачула звон шкла, якое разбіваецца аб падлогу. Адразу ж зразумела, што гэта малы насваволіў. Калі б не тая сітуацыя з караблікам, хутчэй за ўсё, стрымгалоў кінулася б уніз і накрычала б на Сымона. (Часам — думаю, мамы мяне зразумеюць — вельмі цяжка стрымаць сябе і не павысіць голас на дзіця. Крык вырываецца па інерцыі, бо такую рэакцыю на любую правіннасць многія з нас вынеслі са свайго дзяцінства.) Але я зрабіла выгляд, што нічога не чула. Праз дзве хвіліны да мяне падняўся засмучаны малы. Здаецца, адно рэзкае слова — і ён заплача. «Што здарылася?» — пытаюся з усмешкай. — «Мама, я разбіў твой любімы кубак». — «З табой усё ў парадку, не параніўся?» — «Не. Але я так служаўся! Паслухай, як у мяне сэрца грукоча!» — «Сапраўды, моцна, — нахілілася я, каб паслухаць. — Ну, пайшлі паглядзім, што ты там натварыў». На кухні я не стала хаваць свайго засмучэння: «Шкада, канешне, што кубка са сняжынкамі больш няма, гэта быў падарунак на новы год ад маіх сяброў. Наступны раз будзь, калі ласка, больш акуратны. Але галоўнае, што з табой усё добра». Пасля мы разам выпраўлялі сітуацыю. Пакуль я збірала вялікія кавалкі шкла, малы старанна пыласосіў падлогу. Перад сном Сымон паглядзеў мне ў вочы і сказаў: «А я думаў, ты будзеш крычаць». — «Ты рады, што я не злавалася?» Малы кіўнуў у знак згоды і тут жа заснуў з усмешкай на вуснах.

У той вечар я доўга ляжала з заплюшчанымі вачыма ў цемры і таксама ўсміхалася. Цешылася, што сваёй спакойнай рэакцыяй на такія бяскрыўдныя правіннасці мы з мужам пачалі закладваць зярняткі даверлівых адносінаў з сынам. Сёння ён прызнаўся, што разбіў кубак ці пашкодзіў караблік, а заўтра не пабаіцца прыйсці, каб падзяліцца больш сур'ёзнымі перажываннямі. «Задача мамы — спакойна выслухаць, — кажа знаёмая, у якой з дачкой склаліся вельмі даверлівыя адносіны. — Ні ў якім разе не крычаць, не прыніжаць, не асуджаць. І раз і назаўсёды выкрасліць са сваёй свядомасці фразу «Я ж казала...»

Ёсць шмат цудоўных сямейных традыцый: пекчы ў нядзелю зранку бліны, 31 снежня хадзіць усёй сям'ёй у цырк, смажыць сала з хлебам ці маршмелоу (паветраны зефір) на вогнішчы... Але куды важней, пагадзіцеся, укараніць у сваю сям'ю філасофію бяспечнага дома, «дзе любяць і разумеюць, нягледзячы ні на што».

Сёлета прыяцелька адправіла сваю 11-гадовую дачку ў летнік. Там была дзяўчынка, якой мама дала з сабой... электронныя цыгарэты. Іншыя дзеці таксама захацелі. А адна нават пазваніла маме з падобнай просьбай. Калі ж тая нараўла ў трубку і адмовіла, то пакрыўджаная дачка дэманстратыўна запісала яе замест «мама» ў тэлефоне нецэнзурным спалучэннем слоў. «Мяне дачка таксама папрасіла правезці ёй вейпы, — кажа Святлана. — Я сказала, што не змагу выканаць гэтую просьбу, бо люблю яе больш за ўсё на свеце і не хачу нашкодзіць яе здароўю. І прывяла пару прыкладаў, да чаго гэта можа прывесці. Яна зразумела і спакойна паклала трубку». Святлана кажа, што дачка пастаянна расказвае розныя гісторыі пра сваіх сябровак. У прыватнасці, адну з іх мама б'е за адзнакі ніжэй за 8, прыніжае і называе «ганьба нашай сям'і»... Што самае страшнае, для многіх сем'яў крычаць на дзіця — гэта норма...

«Калі мама ў парыве гневу трасе дзіця — яна разбурае яго, — піша Ганна Быкава ў «Вялікай кнізе «Лянівай мамы». — Калі мама захоўвае маску спакою ў момант, калі ўнутры кіпіць злосць — яна разбурае сябе». Бо любая падаўленая эмоцыя застаецца жыць у целе. І праз нейкі час можа выліцца ў сур'ёзную хваробу. Таму псіхолагі і раяць вучыцца кіраваць сваімі эмоцыямі, экалагічна выяўляць іх свету. І ўласным прыкладам перадаваць гэты каштоўны навык дзецям.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Сямейная газета

Выпуск № 16 (198)

Тыя, хто побач

Гюнеш:

«Цяпер для мяне галоўнае — сям'я»

«Беларуская дачка Усходу» — так кажуць пра Гюнеш Абасаву, а яе сямігадовы сын размаўляе на рускай і турэцкай мовах. Гэта не дзіўна, бо муж спявачкі родам з Турцыі. Мы пагаварылі аб сямейным жыцці Гюнеш і разбурылі некаторыя стэрэатыпы пра ўсходніх мужчын.

— Са сваім мужам вы пазнаёміліся ў сацсетках. Раскажыце, хто каго там першы знайшоў і ці лічыце вы такі від знаёмства бяспечным?

— Знайшоў мяне Гёкхан, але ў нашым выпадку сацсеткі — гэта толькі шлях. Прычынай знаёмства быў мой удзел у конкурсе Istanbul Songs — 2010, дзе я прадстаўляла Беларусь. Яму спадабалася, як я спявала на турэцкай мове. А паколькі тады мне прыходзіла шмат паведамленняў, то Гёкхана я нават не адразу заўважыла.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Новыя вяскоўцы

НАЙЛЕПШЫ СРОДАК АД ХАНДРЫ

Зараз стужкі ў «Інстаграме» знаёмых, якія жывуць у горадзе, стракацяць пастамі накшталт «Што мяне выратуе ад восеньскай хандры». І спісы «палачак-выручалачак» ва ўсіх вельмі падобныя. Там ёсць духмяныя шарлоткі, гелі для душа, якія прыемна пахнуць, прагулкі з заглядваннем па дарозе ў новыя для сябе кавярні, прыгожы посуд, аромалямпы з любімымі алеямі, чай з мятай і лімонам, новы яркі гардэроб... Хтосьці дзеліцца любімай падборкай фільмаў пра восень, хтосьці спісам «плаксівых» кніг, які можна пачытаць, захінуўшыся пледам.

Славіла сябе на думцы, што, калі жыла ў Мінску, таксама з надыходам сезона зацяжных дажджоў складала падобныя спісы. У вёсцы ж пра тую восеньскую хандру і не згадваю. Проста няма калі. Бачу гэта і па аднавяскоўцах, для якіх восень, як і лета — «гарачая» пара. У верасні трэба выкапаць бульбу ды ўпарадкаваць іншую гародніну, прыдумаць, што зрабіць з яблыкаў, груш, сліў, алычы, каб не прапалі, угноіць агарод, уладкаваць вяргіні, пасадзіць цыбулю, часнок і цюльпаны на зіму, потым накрыць ружы і абвязаць яблынькі ды грушы яловымі лапкамі, каб зайцы не пагрызлі ўзімку. Адным словам, работы ў вёсцы хопіць да маразоў. А вось тады ўжо можна падумаць пра кніжкі ды серыялы.

...Збярэш гнілыя яблыкі ды маленькія грушкі, якія нападалі суцэльным дыванам з суседскай дзічкі і на наш участак, прысядзеш адпачыць, а наша Ліска і ўсеагульны вясковы любімец Дыванок тут як тут. Восенню каты асабліва ласкавыя і пастаянна дзесьці побач. Якая тут можа быць хандра? Дарэчы, Дыванок і Ліска не ладзяць паміж сабой, але чамусьці менавіта з прыходам халадоў нейкім дзіўным чынам ужываюцца на маіх каленях.

(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)

МАМА — ПЕРШАЕ СЛОВА

Напярэдадні Дня маці, які адзначаецца ў нашай краіне 14 кастрычніка, мы звярнуліся да медыйных персон з просьбай расказаць пра сваіх любімых матуль. Кожны герой рабіў гэта з задавальненнем! А колькі цяпла, трапяткой пяшчоты, а часам і філасофскіх разважанняў было ў іх маналогах...

Дзмітрый ШАБЕЦЯ:

«Мама — адна з самых вялікіх маіх прыхільніц»

Раман у оперы «Сівая легенда», Дубатоўк у «Дзікім паляванні караля Стаха», доктар Фаўст у аднайменнай оперы і Хазэ ў «Кармэн» — гэтыя і шмат іншых вобразаў стварыў Дзмітрый Шабеця на беларускай опернай сцэне. Для кожнага чалавека важна, а для артыста асабліва, каб яго падтрымлівалі родныя, і перш за ўсё мама.

«Мамачка аддае мне шмат увагі, часу, клопату — так было ў дзяцінстве, так працягваецца і дагэтуль, — распавядае Дзмітрый Шабеця, саліст Вялікага тэатра Беларусі. — Мы вельмі блізкія людзі, штодзённы рытуал «сазвону» ў нас адбываецца з усёй сям'ёй: з бабуляй і дзядулем у тым ліку.

Мы жывём у розных гарадах, мама — у нашым родным Гомелі, таму калі мы доўга не бачымся і калі я з'язджаю на гастролі, то заўсёды маем зносіны па відэасувязі. Вось якраз на мінулым тыдні ў мяне былі гастролі ў Маскве, усё ж хочацца паказаць: гатэль, тэатр, сцэны, касцюмы з новых пастановак, абмеркаваць найбліжэйшыя мерапрыемствы, ды проста ўсё, што заўгодна прыемна абмеркаваць разам.

Многія артысты нервуюцца, хвалююцца, калі ведаюць, што ў зале знаходзяцца іх сваякі, але гэта абсалютна не наш выпадак! Мне заўсёды вельмі прыемна, калі мае родныя ў тэатры ці на маіх канцэртах, я заўсёды адчуваю гэтае цяпло з залы. У нашай сям'і пануе вялізная падтрымка. Выходзячы на любы спектакль, канцэрт, конкурс, я адчуваю нябачныя крылы за спінай, бо ведаю, што за мяне моляцца і перажываюць мае родныя! Мама заўсёды прыязджае на мае прэм'ерныя спектаклі. Безумоўна, мама — адна з самых вялікіх маіх прыхільніц! Сам я вяду толькі Instagram, а астатнімі сацсеткамі амаль не карыстаюся, мама маніторыць і расказвае мне пра ўсё: якія каментарыі на пабліках, у тэатральных групах, хто, дзе і калі мне пакінуў лайкі, водгукі і гэтак далей. Часам мне здаецца, што яна яшчэ і мой брэнд-менеджар.

Мама вельмі любіць фатаграфавацца, падарожнічаць, у яе выдатнае пачуццё гумару, яна добры і чулы чалавек. Чалавек, якога я бясконца люблю і паважаю, якому я ўдзячны за ўсё. Вельмі рады, што ў мамы такія цудоўныя адносіны з маёй жонкай, уласна кажучы, як і ў мяне з цешчай.

А яшчэ ў нас заўсёды, як мы жартуем, вельмі пампезныя прыезды адзін да аднаго ў госці! Усе мы вельмі смачна гатуем, у нас сапраўдныя сямейныя застоллі, якія могуць здарыцца абсалютна спантанна. Проста тэлефануеш і кажаш: «Мам, мы зараз прыедзем у Гомель, будзем праз пару гадзін». І мама таксама ладзіць такія візіты-сюрпрызы.

Магу смела сказаць, што мая мамачка найлепшая на свеце, у нас вельмі шмат агульнага, а яшчэ... Яна неверагодна прыгожая жанчына!»

Улада АЛЬХОЎСКАЯ:

«Пакуль ёсць мама, ёсць і чалавек, які ў вас верыць»

Улада Альхоўская пайшла па слядах сваёй маці — пісьменніцы Ганны Альхоўскай. Калісьці ў інтэрв'ю нашай газеце жанчыны прызналіся, што яны — сяброўкі. У іх адсутнічае творчая рэўнасць, затое яны ўмеюць радавацца поспехам адна адной.

«Аднойчы час паскорыць свой ход — ён гэта робіць пасля кожнага вашага дня нараджэння. Усё мінулае падасца бясконца далёкім, сучаснае — тым, што пралятае міма, будучае — надыходзячым занадта хутка. Але пакуль ёсць мама, ёсць і шанц схавацца ў запаветным кутку дзіцячага, цёплага, сапраўднага. Закрануць тое, што ўяўлялася страчаным. Зазямліцца, пераправерыць каштоўнасці, знайсці новыя арыенціры, — разважае Улада Альхоўская. — Аднойчы вам здасца, што ўвесь свет супраць вас —

нічога не атрымалася, мары абярнуліся расчараваннем, лепш ужо не будзе. Але пакуль ёсць мама, ёсць адзін чалавек, які ў вас верыць. Мама каго заўгодна сонейкам не назаве.

Аднойчы вам скажуць, што ва ўсіх бедах вашага сённяшняга дня вінаватая... Мама. Будзьце асцярожныя з верай. Модныя вучэнні хуткаплынныя, ніхто не ідэальны, а любоў вечная.

Аднойчы вы з мамай пасварыцеся. Хоць — не аднойчы, што хаваць. Часам гэта будзе гучна і ненадоўга, часам — абернецца небяспечнымі гадамі неразумення, непрабачэння і своечасова не сказаных слоў. Успомніце пра хуткаплыннасць часу, не дайце яму выслізнуць бязглузда і незваротна.

Люблю цябе, мама, са святам!»

Герман ЦІТОЎ:

«Мая мама маладзее побач са мной!»

Герман Цітоў шырока вядомы як спявак і тэлевядучы, а яшчэ ён з'яўляецца лаўрэатам музычнай прэміі «Песня года Беларусі», піша музыку для топавых выканаўцаў. Журналісты ведаюць, што Герман не дае інтэрв'ю пра асабістае жыццё. А вось пра сваю маму расказаў.

«Мая мама — чалавек, якому я бязмежна ўдзячны. Самы вялікі падарунак нам робяць бацькі — дораць жыццё. Ёсць такое меркаванне, што жанчыны нараджаюць дзяцей для сябе. І сапраўды, мама з першых імгненняў жыцця дзіцяці побач з ім, якое любіць проста таму, што яно ёсць, — кажа Герман Цітоў. — Мая мама заўсёды дорыць мне свабоду, ніколі і ні ў чым «не цісне». Мама дае магчымасць пражыць сваё жыццё, самому здзейсніць свае памылкі, і ў той жа час вельмі засцерагае ад нейкіх учынкаў, якія могуць мець негатыўныя наступствы. Робіць гэта неверагодна далікатна: не дае прамую параду, а наводзіць на правільную думку.

У мяне даволі запальчывы характар, мама гэта ведае. Таму ініцыятарам усіх нашых сур'ёзных размоў звычайна выступаю я. Мне 37 гадоў, мама ні разу не спытала, калі я ажанюся. Калі я захачу, то магу з мамай падзяліцца асабістым і патаемным.

Мне вельмі падабаецца, што мая мама маладзее побач са мной! Мама ўсім цікавіцца: яна ведае ўсе навамодныя слоўцы, выдатна спраўляецца з рознымі гаджэтамі, сучасна выглядае. Яна цудоўная, таму што і мама, і сяброўка ў адной асобе!

Яшчэ я вельмі ўдзячны маці за тое, што яна ніколі не ўспамінае нічога дрэннага з майго жыцця, а толькі пазітыў.

Мая мама — далікатная, прыгожая, разумная, мудрая — люблю, захапляюся і дзякую!»

Вольга НЯФЁДАВА:

«Мама была вельмі мудрай жанчынай»

Вольга Няфёдава вядомая як радыё- і тэлевядучая. Яна стварыла яркія вобразы ў кіно і запамінальныя ў тэатры. Звання Заслужанай артысткі Беларусі Вольга Няфёдава ўдастоена летась. Можна сказаць: «Шкада, што мама не дажыла да гэтага моманту». Але хто ведае — можа, недзе адтуль, з нябёсаў, яе мама ўсё бачыць...

«Мая мама — гэта мой свет, маё жыццё. Мама памерла сем гадоў таму, але не праходзіць і дня, каб я не ўспомніла яе, у думках не гаварыла з ёй. Першы год пасля смерці маці кожны дзень ездзіла на могілкі. Тады ад перажыванняў у мяне паралізавала нагу, быў доўгі перыяд рэабілітацыі, вучылася зноўку хадзіць. З гадамі боль прытупіўся, але стаў... глабальным, — кажа Вольга Няфёдава, мастацкі кіраўнік Купалаўскага тэатра. — У нас з мамай ніколі не было адносін «сюсі-пусі». Мы маглі спрачацца, нават лаяцца, але пры гэтым заставацца вельмі блізкімі людзьмі. Мама і карала мяне... У першы клас я хадзіла ў школу ў Ждановічах. Ад школы да дома — пяць кіламетраў, па дзіцячых мерках — вельмі далёка. Нашая невялікая дзіцячая кампанія па дарозе здымала шапкі, тады такая мода была. А ў мяне да таго ж вельмі прыгожая стрыжка, так што я яе з задавальненнем дэманстравала. Мама даведалася пра гэта. Спакойна паразмаўляла са мной, патлумачыла, што вельмі небяспечна застудзіць галаву. Я паабяцала, што буду хадзіць у шапцы, але слова не стрымала. Маме зноў суседкі падказалі, што я без шапкі. Тады мама мяне схапіла і пакаралі стрыжку. Потым павяла ў цырульню. Майстар пытаецца: маўляў, хто ж так жудасна падстрыг гэта дзіця? І мая прыгожая, уся такая рэспектабельная мама спакойна адказвае: «Гэта я». Замест моднага сэсану ў мяне з'явілася просценькая дзіцячая стрыжка. І, вядома, пасля гэтага я ўжо хадзіла ў шапцы.

У класе сёмым я аб'явіла, што хачу стаць актрысай. Бацькі былі ў шоку. У нас амаль уся радня інжынеры, а тут артыстка. Вельмі ўдзячная бацькам, што ўсё ж такі далі мне магчымасць самой абраць прафесію. А мама нават у царкву хадзіла, ставіла свечкі, каб я паспяхова здала іспыты, а потым яшчэ год — ужо ў якасці падзякі за тое, што я паступіла.

Мама была вельмі мудрай жанчынай. Калісьці я была не згодна з нейкімі яе меркаваннямі пра канкрэтных людзей, а потым аказалася, што яна мела рацыю.

Няма нічога на свеце мацней за безумоўную матуліну любоў, калі цябе прымаюць такой, якая ты ёсць. Я адчуваю гэта. І я думаю, што вось гэтая вялікая любоў і сёння дае мне сілы вытрымаць усе выпрабаванні».

Маргарыта ДРАЗДОВА.
Фота з асабістых архіваў герояў.

«Цяпер для мяне галоўнае — сям'я»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Нам было цікава размаўляць па перапісцы, але ніякіх сур'ёзных планаў у мяне не было. Калі шчыра, то лічыла, што знаёміцца ў сацсетках неяк не зусім правільна.

Гёкхан у той час жыў на Кіпры, трэніраваў футбольную каманду. Настойліва запрашаў мяне ў госці. І калі прыйшоў час майго адпачынку, мы з сяброўкай вырашылі правесці яго на Кіпры і заадно сустрэцца асабіста з Гёкханам. Аказалася, што стрыечны брат Гёкхана — спявак, а мы з яго дзяўчынай (таксама артысткай) нават удзельнічалі ў адным вакальным конкурсе. Мы пасябравалі, вось праз яе і даведалася, што Гёкхан сапраўды футбаліст, нарадзіўся ў Стамбуле ў добрай сям'і.

Увогуле, зараз я лічу, што знаёмствы ў сацсетках — гэта прымальна, галоўнае — паклапаціцца аб сваёй бяспецы. Калі жанчына едзе ў іншую краіну, у яе элементарна павінны быць свае грошы на жыццё там і зваротны білет.

«Сын — вельмі шчыры і добры хлопчык, і нам трэба знайсці такі баланс, каб, захоўваючы гэтыя якасці, ён мог і пастаяць за сябе».

— Як хутка Гёкхан прыляцеў з візітам у адказ?

— Праз два месяцы. Тады ж адбылося яго знаёмства з маімі бацькамі, і гэта была ўзаемная сімпатыя. Гёкхану спадабалася ў бацькоў у Баранавічах, а таксама ён закахаўся ў Мінск. Праўда, ён думаў, што Беларусь — гэта Расія, і мне давялося яму тлумачыць, што гэта розныя краіны.

— А як прайшло ваша знаёмства з бацькамі Гёкхана?

— Таксама вельмі цёпла. Яго тата ў першы ж дзень пачаў называць мяне дачушкай. А вось мама крыху баялася: што за нявестка — артыстка? Тым больш што ў Турцыі эстрадныя артысты, скажам так, значна больш разняволеныя, чым нашы. Ужо даўно мы са свякроўю сябруем, кожны дзень стэлефаноўваемся, я вывучыла турэцкую мову.

— Як доўга вы прыглядаліся адзін да аднаго?

— Два гады. У асноўным гэта быў раман на адлегласці. Канешне, мы ездзілі ў госці адзін да аднаго, але гэта зусім не тое, калі людзі жывуць у адной краіне. Мне было важна пераканацца, што Гёкхан — чалавек, з якім я хачу пражыць усё жыццё, і ўжо ў гэтым нашы меркаванні сышліся.

— Рэгістравалі шлюб вы ў Мінску, а вяселле было ў Стамбуле. Чым адрозніваецца беларускае вяселле ад турэцкага?

— На нашым вяселлі было больш за 500 чалавек. Галоўным чынам гэта родныя і сябры сям'і Гёкхана. У Турцыі ёсць традыцыя — нявеста павінна танцаваць і ўсміхацца. Для мяне гэта аказалася ў некаторым сэнсе выпрабаваннем. Мой рост — 156 сантыметраў, і каб не ўкарочваць вясельную сукенку, падол якой быў раскошна ўпрыгожаны, прыйшлося надзець туфлі на 18-сантыметровым абцасе. У іх я чатыры гадзіны танцавала. Банкет на турэцкім вяселлі арганізаваны ў фармаце фуршэту. Маладзёнам дораць грошы і залатыя манеты. Для такой вялікай колькасці гасцей бацька Гёкхана арандаваў палац.

— А памятаеце першы сямейны канфлікт?

— Першы здарыўся яшчэ да вяселля. Гёкхан хацеў, каб я пераехала на Кіпр. У яго там ёсць знаёмыя ў сферы шоу-бізнесу, і ён абяцаў мне падтрымку. Але я сказала, што маё месца ў Беларусі, што не ўяўляю, як спяваць у іншай краіне. Два месяцы Гёкхан маўчаў, а потым прыехаў у Мінск. Ён мяне зразумеў і падтрымаў маё рашэнне. Вядома, часам мы спрачаемся, але і агульную мову знаходзіць умеем.

«Гёкхан закахаўся ў Беларусь. Яму тут падабаецца, і ў першую чаргу — людзі. Ён кажа, што беларусы — самы добры народ».

— На якіх мовах вы размаўляеце дома?

— На рускай і турэцкай. Праўда, Гёкхан кажа, што руская мова — самая складаная ў свеце, пакуль у яго не ўсё атрымліваецца. Сёлета наш сын пайшоў у першы клас, так што дададуцца беларуская і англійская.

— Гюнеш, з вашай актыўнасцю на сцэне, удзелам у розных конкурсах, напэўна, няпроста было запланаваць нараджэнне дзіцяці?

— Мы рыхтаваліся да яго з'яўлення, бо яно для нас вельмі жаданае. Па гараскопе я — Дзева, значыць, усё павінна быць пад кантролем. Таму наведалі дактароў, прайшлі шэраг абследаванняў, каб выключыць якія-небудзь рызыкі і пагрозы.

Недзе на пятым месяцы цяжарнасці я ўзяла паўзу ў выступленнях, бо лічу, што з вялікім жывоцікам не трэба выходзіць на сцэну. У дэкрэтным водпуску рэдка ўдзельнічала ў канцэртах, — хацелася атрымаць асалоду ад мацярынства. Пасля нараджэння Гёкдэніза я дакладна зразумела, што цяпер для мяне галоўнае — сям'я.

— Дзе вы нараджалі сына?

— У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Маці і дзіця», таму што давяраю беларускім дактарам. І магу сказаць, што там працуюць суперпрафесіяналы і ствараюць вельмі камфортную псіхалагічную атмасферу для жанчын.

— А які Гёкхан бацька? Вы са спакойнай душой пакідалі на яго маленькага сына ці, можа, запрашалі няньку?

— Гёкхан — выдатны бацька! Ён і па начах уставаў да сына. А яшчэ нам дапамагала мая мама, за гэта мы ёй непамерна ўдзячныя. Вырашыцца на запрашэнне нянькі для мяне было б неверагодна цяжка.

— Ці адрозніваюцца падыходы ў выхаванні сына ў вас і мужа?

— Адносіны мужа і сына сяброўскія, я больш строгая. Гёкхан мае зносіны з сынам на роўных, а я больш бачу ў ім дзіця.

— Хто выбіраў імя сыну?

— Мне хацелася назваць яго Дзянісам, а муж прапанаваў Гёкдэніз, што значыць «нябеснае мора». Імя мужа перакладаецца як «уладар неба», а маё — «сонца». У гімназіі сын адразу папрасіў аднакласнікаў звяртацца да яго Гёкдэніз.

— Ці заўважаеце ў Гёкдэніза цікавасць да музыкі?

— Мы — тыя бацькі, якія мараць, каб дзіця пайшло па іх слядах. Але сын кажа, што яму не падабаецца мая праца, бо ў мяне то канцэрты, то работа ў студыі, і толькі малую частку часу я магу праводзіць дома. У футбол ён гуляе, але як прафесію таксама яго не разглядае. Цяпер ён захоплены геаграфіяй, ведае такія краіны і гарады, пра якія я нават не чула. У яго ёсць глобус, папрасіў вялікую палітычную карту свету, якая вісіць у яго пакоі. Яшчэ сын любіць матэматыку — тут, відаць, адбіваецца тое, што бацька Гёкхана — эканаміст, а яго старэйшы брат — банкаўскі работнік. Нядаўна Гёкдэніз папрасіў запісаць яго ў гурток па шахматах, растлумачыў нам, што «гэта для разумненькіх».

Мы цудоўна разумеем, што за дзесяць гадоў у сына могуць памяняцца інтарэсы, і гэта нармальна. Трэба ўлічваць і тое, што прафесіі, якія сёння падаюцца перспектыўнымі, праз тыя ж дзесяць гадоў могуць стаць неактуальнымі. Сын сам будзе выбіраць прафесію, а мы ў любым выпадку яго падтрымаем. Цяпер важней, якім чалавекам вырасце Гёкдэніз. Сын — вельмі шчыры і добры хлопчык, і нам трэба знайсці такі баланс, каб, захоўваючы гэтыя якасці, ён мог і пастаяць за сябе.

— Гюнеш, а чым займаецца ваш муж і ці не расчараваны ён у тым, што пераехаў у Беларусь?

— Гёкхан займаецца любімай справай — трэніруе ўласную футбольную каманду Turkspor, у якую ўваходзяць грамадзяне Турцыі, якія жывуць у нашай краіне, і беларусы. Гэтым Гёкхан хоча падкрэсліць сяброўства і павагу паміж дзвюма краінамі.

Каманда займае лідарскія пазіцыі ў аматарскай лізе, удзельнічае ў дабрачынных акцыях, праводзіць мноства майстар-класаў. Мой муж марыць адкрыць школу футбола для дзяцей, каб перадаць ім досвед і шматлікія тэхнікі гэтай няпростай стратэгічнай гульні.

Гёкхан закахаўся ў Беларусь. Яму тут падабаецца, і ў першую чаргу — людзі. Ён кажа, што беларусы — самы добры народ.

«Яго тата ў першы ж дзень пачаў называць мяне дачушкай. А вось мама крыху баялася: што за нявестка — артыстка? Тым больш што ў Турцыі эстрадныя артысты, скажам так, значна больш разняволеныя, чым нашы».

— Як размяркоўваеце хатнія абавязкі?

— Вельмі люблю гатаваць. Мая мама — шэф-кухар, таму яна мяне з дзяцінства навучыла. У мяне добра атрымліваюцца стравы беларускай і азербайджанскай кухні. Цяпер умею гатаваць і турэцкія стравы. Памятаю, як пасля вяселля прыехалі ў госці да сваякоў Гёкхана, якія жывуць у вёсцы. Свякроў кажа: «Вы не глядзіце, што Гюнеш — артыстка, яна ўмее смачна гатаваць».

Гёкхан — майстар па дэсертах. Муж дапамагае мне з прыборкай кватэры. Гёкхан па гараскопе Рак, а гэта такія людзі, у якіх усё ляжыць па палічках, што, дарэчы, вельмі зручна.

— Якая ў вашай сям'і формула адносін з фінансамі?

— Блізкая да той, што мой заробак — гэта мой, а Гёкхана — гэта сямейны бюджэт. Калі мне трэба купіць нешта такое, што выходзіць за рамкі маіх асабістых фінансавых магчымасцяў, я кажу мужу. Ведаю, што ён ніколі не адмовіць.

У нас склалася такая традыцыя, што ў супермаркет едзем усёй сям'ёй. Кожны выбірае, што яму падабаецца. Першы час Гёкдэніз клаў у кошык тры шакаладкі. Але мы здолелі яму растлумачыць, што дастаткова адной. Ён абсалютна спакойна навучыўся выбіраць. Больш за тое, сын вучыць нас эканоміць. Напрыклад, ён можа зрабіць мне заўвагу, калі забылася выключыць святло ў пакоі. Прычым размова не толькі аб грошах. Ён ужо заўважыў, што ў Турцыі вада вельмі дарагая, бачыць, як там яе эканомяць. Ведае, што ў Беларусі так шмат вады, што мы можам падзяліцца з іншымі, але ўсё роўна трэба беражліва ставіцца да прыродных рэсурсаў.

— Калі вы адпраўляецеся на гастролі, муж і сын суправаджаюць вас?

— Не. У кожнага з нас свая прафесійная прастора, мы да гэтага ставімся вельмі паважліва. Гёкдэніз таксама застаецца дома з татам ці з бабуляй. Браць дзіця на гастролі, на мой, погляд, не лепшая ідэя. Мы ж там працуем — саўнд-чэк, грым, канцэрт. Дадому прыязджаю позна, а ў дзіцяці павінен быць нармальны рэжым дня.

«Гёкхан хацеў, каб я пераехала на Кіпр. У яго там ёсць знаёмыя ў сферы шоу-бізнесу, і ён абяцаў мне падтрымку. Але я сказала, што маё месца ў Беларусі, што не ўяўляю, як спяваць у іншай краіне».

Усе разам мы ездзім адпачываць. Вельмі любім наведваць маіх бацькоў у Баранавічах. У іх прыватны дом, там цудоўна ў любую пару года. Стараемся знайсці час і паглядзець нешта цікавае ў Беларусі.

Мне падабаецца гасцяваць у Стамбуле — там я забываю пра работу, атрымліваецца цалкам перазагрузіцца. А лепш за ўсё Гёкдэнізу: і ў Турцыі, і ў Беларусі ёсць дзядулі і бабулі, якія яго вельмі любяць.

— Гюнеш, вы сказалі, што паважаеце прафесійную прастору адно аднаго. А асабістую прастору ўдаецца захаваць?

— Вядома. Я замужам дзевяць гадоў, а мае сяброўкі ўсё яшчэ дзівяцца, што муж мяне адпускае з імі павячэраць у кафэ. Мусіць, паданні аб усходніх мужчынах, паказаныя ў кнігах і кіно, аказаліся жывучыя. Але яны зусім не датычацца сучасных мужчын. У мужа таксама з'явіліся сябры ў Беларусі, і калі яны хочуць сабрацца сваёй кампаніяй, я не пярэчу. Думаю, што давер і павага не менш важныя ў сямейным жыцці, чым каханне.

Маргарыта ДРАЗДОВА.
Фота з асабістага архіва Гюнеш АБАСАВАЙ.

Тэлевізар — па раскладзе, смартфон і ноўтбук — не ў зоне дасяжнасці

Як прабудзіць і захаваць у дзяцей цікавасць да чытання?

Сёння, у час інтэрнэту і гаджэтаў, кожны з нас не раз чуў фразу, што сучасныя дзеці не чытаюць. А тыя, што чытаюць, выбіраюць электронныя кнігі. Мы вырашылі даведацца, ці насамрэч гэта так. І накіраваліся ў сталічную дзіцячую бібліятэку № 6 імя Васіля Віткі, вядомую сваім крэатыўным падыходам да ўзаемадзеяння з чытачамі.

Казкі для вундэркіндаў

У чытальнай зале бібліятэкі якраз праходзіла сустрэча з выхаванцамі дзіцячага садка, што месціцца непадалёку. Пасля мерапрыемства маленькія чытачы з задавальненнем гарталі кнігі. А аднаго хлопчыка ледзь удалося ўгаварыць вярнуцца ў садок — так ён захапіўся маляўнічай дзіцячай энцыклапедыяй пра павукоў.

— Школьнікі і дашкольнікі — частыя госці ў нашай бібліятэцы, — кажа **бібліятэкар Наталля АКУЛЕНКА.** — Мы ладзім для іх шмат цікавых мерапрыемстваў з конкурсамі, віктарынамі, майстар-класамі. Святкуем разам дзень лялькі, кавуна, марожанага, сяброўства. Пры дапамозе кніг здзяйсняем з дзецьмі віртуальнае падарожжа ў космас, адпраўляемся ў захапляльную экспедыцыю ў Антарктыду, у лес на «цікае паляванне», вандруем па ўнікальных месцах Беларусі. У мяне ёсць цікавае мерапрыемства — «Сем цудаў Белавежскай пушчы», падрыхтаванае па аднайменнай кнізе. І шораз школьнікі здзіўляюцца: «Божа, і квакша ў нас ёсць! І зуброў у нас лічаць з квадракоптараў!» Потым пра гэта расказваюць бацькам. І нярэдка разам едуць туды, каб пабачыць усё на ўласныя вочы.

Па выхадных у бібліятэцы праходзяць дні сямейнага адпачынку, на якія чытачы прыходзяць цэлымі сем'ямі. Кожны раз яны прысвечаныя нейкай новай тэме: «Карнавал прафесій», «Гэтыя дзівосныя сабакі»... Творчыя супрацоўнікі бібліятэкі разам з бацькамі і дзеткамі чытаюць услых, гуляюць, майструюць вырабы сваімі рукамі.

— Нашы сустрэчы праходзяць у чытальнай зале, — працягвае Наталля Акуленка. — Таму, каб прыцягнуць іх увагу, на самае бачнае месца выстаўляем маляўнічыя кнігі з яркімі вокладкамі. Пры гэтым стараемся рабіць падборкі, накіраваныя на развіццё дзяцей, сочым, каб кніга была не толькі з яркімі ілюстрацыямі, але яшчэ і пазнавальная. Адны з самых любімых, хадавых кніг у бібліятэцы — гэта дзіцячыя энцыклапедыі. Хлопчыкі і дзяўчынкі любяць даведвацца штосьці новае пра жывёл, птушак, рыб, прыроду, асабліва беларускую. І нядзіўна: у нас столькі цікавага! Наогул, школьнікаў вельмі прыцягвае тое, што знаходзіцца ў зоне дасягальнасці, галоўнае, ім пра гэта займальна распавесці. Дзякуючы сучасным беларускім аўтарам, з гэтым праблем няма. У прыватнасці, нашым чытачам спадабалася новая кніга Генадзя Аўласенкі «Таямніцы назваў». У ёй аўтар у казачнай форме паспрабаваў адказаць на пытанні, чаму той ці іншы населены пункт (Дукора, Дудзічы і іншыя), што знаходзіцца на Пухаўшчыне, мае сваю назву.

Вельмі любяць дзеці і сустрэчы з аўтарамі кніг — у многіх з іх вельмі крэатыўны падыход.

— Кацярына Хадасевіч-Лісавая не толькі прыносіць з сабой рукатворных герояў сваіх гісторый, але і сама пераапранаецца ў касцюмы казачных істот, — распавядае бібліятэкар. — Алена Масла перад Новым годам вучыла дзяцей падпісваць паштоўкі. Часты госць нашай бібліятэкі, пісьменнік і былы галоўны рэдактар «Вясёлкі» (дарэчы, у бібліятэцы ёсць філіял музея часопіса «Вясёлка») Уладзімір Ліпскі даваў майстар-клас па напісанні казак. У захапленні школьнікі і ад сустрэч з Ірынай Токаравай. Яе кнігі аб прыгодах хлопчыка Ціма з серыі «Казкі для вундэркіндаў» не толькі цікавыя і займальныя, але і пазнавальныя, развіццёвыя. Там не толькі цуды (дзеці могуць разам з галоўным героем пры дапамозе чароўнага гадзінніка перанесціся з адной эпохі ў іншую), але і этнаграфія, і фальклор — і ўсё ў гульнявой форме.

— Не верце, што дзеці перасталі чытаць, гэта міф, — адрэагавала на маё пытанне **загадчык сектара Таццяна МАКАРЭВІЧ.** — Я больш за 20 гадоў працую ў бібліятэчнай сістэме і магу ўпэўнена сказаць, што сёння, як і раней, ёсць дзеці, якія чытаюць вельмі шмат. Ёсць такія, якія робяць гэта з-пад палкі. Разам з тым яны ўсё адно развітыя, кемлівыя, бо інфармацыю чэрпаюць адусюль, у тым ліку і з інтэрнэту.

Менш забароненых тэм

Дзеці бяруць у бібліятэцы вельмі шмат кніг па школьнай праграме як беларускіх, так і замежных аўтараў. Цудоўна, што зараз вельмі многія творы класікаў перавыдаюцца ў новым, сучасным выглядзе і становяцца больш прывабнымі у тым ліку і для самых маленькіх чытачоў (гэта тоненькія кнігі з яркімі ілюстрацыямі).

— Шмат чытаюць дзеці і па-за школьнай праграмай. Больш за ўсё яны любяць фантастыку — кажа **бібліятэкар Ганна ЦІТАРЭНКА.** — Дзяўчынкам і хлопчыкам малодшага школьнага ўзросту падабаюцца чароўныя гісторыі пра жывёл, якія дапамагаюць паверыць у цуды. Старэйшым цікава чытаць гісторыі пра сваіх аднагодкаў, такіх жа дзяцей, як яны, якія адчуваюць тое ж, што яны. Бо ім прасцей атаясамліваць сябе з блізкім і зразумелым героем, чым з дамамі ў крыналінах з класічнай літаратуры. У прыватнасці, на «ўра» заходзяць прыгодніцкія гісторыі, якія адбываюцца ў школе. Разам з героямі школьнік праходзіць выпрабаванні, суперажывае яго пачуццям.

— Самыя чытаныя ў свеце кнігі — гэта Біблія і «Гары Потэр». У нашай бібліятэцы гісторыя аб прыгодах Гары Потэра таксама карыстаюцца папулярнасцю. Прычым як сярод дзяўчынак, так і сярод хлопчыкаў, — кажа Таццяна Макарэвіч. — Па просьбах дзяцей мы сабралі ўсю серыю кніг, у тым ліку і ў беларускамоўным перакладзе.

— Мая Жэня чытае ў асноўным на рускай мове, бо ёй так прасцей, — распавядае пастаянная наведвальніца бібліятэкі Ірына, мама дзевяцігадовай Яўгеніі. — Але свайго любімага Гары Потэра з задавальненнем перачытала і па-беларуску. Цудоўна, што робяцца пераклады топавых дзіцячых кніг на родную мову. Пакуль ёсць толькі тры часткі Гары Потэра на беларускай, вельмі чакаем, калі перакладуць іншыя.

— Мы стараемся зацікавіць дзетак кнігамі на роднай мове. Ужо традыцыйнымі сталі нашы «Беларускі чацвер» і «Віткаўскія чытанні» (у бібліятэцы ёсць музей Васіля Віткі, які знаёміць з дзіўным светам пісьменніка-казачніка і гумарыста). Дзеці да іх таксама рыхтуюцца, вучаць вершы і чытаюць іх уголас. Прычым робяць гэта вельмі крэатыўна. У прыватнасці, дзяўчынкі прачыталі казку «Вавёрчына гора» па ролях з ноткамі рэпу, а хлопчык-школьнік па-акцёрску абыграў верш «Партрэт» — чытаючы яго ўголас, паралельна паэтапна ствараў малюнак на мальберце. Наш незаменны памочнік у папулярызацыі кнігі — лялечны тэатр «Пацешка», мы яго актыўна выкарыстоўваем на мерапрыемствах, ставім спектаклі па матывах твораў беларускіх і замежных аўтараў. Такія творчыя сустрэчы патрэбныя і цікавыя дзецям. Яны ўзаемна абагачаюць і накіроўваюць іх энергію ў патрэбнае рэчышча.

Паводле слоў бібліятэкараў, вучні старэйшых класаў цікавяцца спецыялізаванай літаратурай па псіхалогіі, у тым ліку пра ўзаемаадносіны бацькоў і дзяцей. Падлеткі ўсё часцей выбіраюць кнігі, якія закранаюць складаныя тэмы з рэальнага жыцця: развод мамы і таты, хваробы, страта блізкага. Нават сучасныя кніжкі-карцінкі, арыентаваныя на дашкольнікаў, уздымаюць такія тэмы, проста яны гавораць пра іх зразумелай і разам з тым вельмі метафарычнай, вобразнай мовай. У кнігах для падлеткаў часта закранаюцца тэмы школьнага цкавання (булінгу), прыняцця сябе і наладжвання адносін з навакольнымі. Гэтыя тэксты больш прамалінейныя, чым кнігі для малых, яны называюць рэчы сваімі імёнамі, але сэнс застаецца нязменны: чытаючы аб душэўных перажываннях героя, школьнік разумее, што ён не адзін, бачыць розныя прыклады ўзаемаадносін і жыццёвых сітуацый. У цэлым, можна сказаць, што ў дзіцячай кнізе з'явілася значна больш псіхалагізму, больш увагі нададзена перажыванням і пачуццям. Становіцца менш забароненых тэм.

Класіка ў... коміксе

Кнізе сёння даводзіцца канкурыраваць і з кіно, і з камп'ютарнымі гульнямі, і з рэаліці-шоу, і з патокам пастоў у сацсетках. Таму супрацоўнікі бібліятэкі стараюцца быць на адной хвалі са сваімі чытачамі. Робяць агляды на кнігі-навінкі ў сацсетках: і «Укантакце», «Інстаграме». Нават завялі TikTok, які актыўна карыстаецца папулярнасцю сярод падлеткаў.

— Апошнім часам вельмі запатрабаваныя кнігі, напісаныя ці афармленыя ў стылі графічнага рамана, дзе малюнкаў больш, чым тэксту, — кажа Таццяна Макарэвіч. — Іх складана злавіць на бібліятэчных палічках, яны практычна заўсёды на руках у чытачоў. Адзін здае і тут жа другі прыбягае і забірае. Школьнікі бяруць і чытаюць коміксы з задавальненнем.

Некаторым бацькам, ведаю, не надта падабаецца, што іх дзеці выбіраюць коміксы. Але не варта быць такімі катэгарычнымі. Камусьці менавіта яны могуць дапамагчы прыйсці да чытання. Напрыклад, малодшая дачка маёй знаёмай палюбіла чытаць менавіта дзякуючы коміксу пра оселка Арыёля. Смешная гісторыя ў малюнках пра французскіх школьнікаў у выглядзе жывёл растапіла яе сэрца. І калі раней яе трэба было ўгаворваць пачытаць перад сном, то цяпер без кнігі не ляжа спаць.

— Што цікава, класіка таксама зараз усё больш выпускаецца ў фармаце графічнага рамана. У прыватнасці, у нашай бібліятэцы ёсць «Дзённік Ганны Франк» у такім выглядзе. Гэта кранальная гісторыя пра дзяўчынку-падлетка, якая тры гады, пакуль разам з сям'ёй хавалася ў сховішчы ад нацыстаў, вяла дзённік. Там распавядае пра свае перажыванні, сям'ю, сяброў — і ўсё гэта на фоне катастрофы вайны. Гэта сур'ёзная літаратура, якая, здавалася б, не вельмі прыцягвае падлеткаў. Але ў фармаце графічнага рамана школьнікі ахвотна чытаюць пра вайну.

Не любяць сучасныя дзеці доўгія апісанні. Раней пісьменнікі часта выкарыстоўвалі іх для таго, каб чытач мог уявіць сабе іншыя краіны, пейзаж ці будову караблёў. Цяпер школьнікі маюць магчымасць «пагугліць», паглядзець, як выглядае трапічны лес, праз які прабіраецца галоўны герой, на YouTube. Ім не так патрэбныя доўгія апісанні — важней дынаміка.

Паводле слоў бібліятэкараў, карыстаецца папулярнасцю сярод сучасных школьнікаў і класіка нашага дзяцінства — «Чараўнік Смарагдавага горада», «Каралеўства крывых люстэркаў», «У краіне нявывучаных урокаў»...

Як прабудзіць і захаваць у дзяцей цікавасць да чытання? Усе мае суразмоўцы сышліся ў меркаванні, што любоў да кнігі лепш за ўсё прывіваць з маленькага ўзросту, для гэтага дастаткова, каб чыталі бацькі, ну, ці хаця б адзін з іх. І, вядома, трэба абмяжоўваць час карыстання гаджэтамі.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота з архіва бібліятэкі № 6 імя Васіля Віткі.

АСАБЛІВАСЦІ ПЕРАХОДНАГА ЎЗРОСТУ

Што варта казаць падлеткам пра палавое выхаванне

Штогод у свеце сярод дзяўчынак ва ўзросце 15—19 гадоў рэгіструецца 12 мільёнаў выпадкаў родаў (у краінах, якія развіваюцца), 10 мільёнаў выпадкаў непажаданай цяжарнасці, 5,6 мільёна абортаў, прычым 3,9 мільёна з іх носяць небяспечны характар, што спрыяе росту мацярынскай смяротнасці. Трэба сказаць, што ў Беларусі зніжэнне мацярынскай смяротнасці адбываецца хутчэй, чым у іншых краінах, і яна складае ўсяго два выпадкі на 100 тысяч родаў. Пры гэтым праўдзівая і праверэная інфармацыя пра рэпрадуктыўнае здароўе, у прыватнасці прафілактыку інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, падлеткавую цяжарнасць і аборты, мусіць быць даступнай для маладых людзей і дзяўчат. Але як правільна падаваць яе моладзі?

ІНІЦЫЯТАРЫ РАЗМОЎ — БАЦЬКІ

У 2020 годзе ў Беларусі было праведзена даследаванне, якое складалася з выбарачнага апытання бацькоў школьнікаў ад 6 да 18 гадоў. Апыталі каля 1000 рэспандэнтаў, з якіх 53,7 % — жанчыны.

Больш за 60 % бацькоў выступалі ініцыятарамі размоў з дзецьмі на інтымныя тэмы. Але палове з іх было складана падабраць словы, якія адпавядаюць узросту дзіцяці, 37 % зведвалі пачуццё няёмкасці пры размове, 23 % не змаглі зразумела растлумачыць тое, што хацелі данесці, у 21 % узніклі сумненні ў дакладнасці ўласных ведаў.

Дарэчы, амаль палова рэспандэнтаў мяркуе, што пытанням палавога выхавання павінны займацца ў роўнай ступені школа і бацькі. Больш за 60 % апошніх да адукацыйных праграм у галіне палавога развіцця і здароўя станоўча, 15,2 % — нейтральна. І толькі зусім невялікі працэнт бацькоў баіцца, што адукацыйныя праграмы такога кшталту могуць нанесці шкоду дзіцяці.

ІНФАРМАЦЫЯ МУСІЦЬ АДПАВЯДАЦЬ УЗРОСТУ

Многія бацькі, асабліва тыя, у якіх дзеці яшчэ не дасягнулі школьнага ўзросту, задаюцца пытаннем: а ці не малое маё дзіця для падобнай інфармацыі? Адказ на яго дае **дзіцячы і падлеткавы псіхолаг, гешальт-тэрапеўт Вольга ДРЫЛА**:

— Любая інфармацыя можа падавацца ў адпаведнасці з узростам дзіцяці. Напрыклад, дашкольнік не маленькі для інфармацыі аб тым, як называюцца яго палавыя органы. І наогул, палавое выхаванне — гэта не толькі тое «страшнае» слова з чатырох літар. Гэта вельмі шырокая інфармацыя для розных узростаў. Яна датычыцца як фізіялагічных, так і псіхалагічных аспектаў сталення дзіцяці. Сюды ўваходзіць інфармацыя, напрыклад, аб асабістых межах, аб зменах, якія адбываюцца з целам пры палавым паспяванні, аб супрацьзачаткавых сродках і многае іншае.

Калі бацькі перажываюць, ці змогуць правільна і проста растлумачыць дзіцяці нейкія рэчы, Вольга Дрыла раіць не спрабаваць вынайсці веласіпед, а звярнуцца да чужога вопыту — псіхолагаў, спецыяльнай літаратуры.

ЯК НЕ АБУДЗІЦЬ ЛІШНІ ІНТАРЭС?

Гэта яшчэ адно з пытанняў, якое хвалюе бацькоў.

— Калі даваць інфармацыю ў адпаведнасці з узростам дзіцяці і заставацца ў рамках яго пытання, то дадатковай цікавасці гэта не выкліча. Наогул, цікавасць часцей за ўсё дзеці праяўляюць да таго, што дарослыя не тлумачаць, але забараняюць, — супакойвае Вольга Дрыла.

Але ці законнае палавое выхаванне?

— Так. Паводле дзейнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, да псіхолагаў і псіхатэрапеўтаў непаўналетнія могуць звяртацца па ананімную дапамогу, — тлумачыць эксперт.

КАНФІДЭНЦЫЯЛЬНА І ПРАЎДЗІВА

Крыніцай надзейнай і праўдзівай інфармацыі могуць быць не толькі бацькі ці школьны псіхолаг. Не сакрэт, што сёння падлеткі шмат часу праводзяць у сусветным павуцінні і гэта адна з самых папулярных крыніц ведаў для іх. Таму вельмі важная якасць той інфармацыі, якую яны атрымліваюць. Напрыклад, фонд ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі падпісаў Мемарандум аб узаемаразуменні з праектам Intimatica, які дапамагае падлеткам, моладзі і іх бацькам проста і даступна атрымліваць дакладныя звесткі ў пытаннях рэпрадуктыўнага здароўя.

Толькі зусім невялікі працэнт бацькоў баіцца, што адукацыйныя праграмы такога кшталту могуць нанесці шкоду дзіцяці.

— Такія мабільныя дадаткі, як Intimatica App, дапамогуць і бацькам, і маладым людзям атрымаць веды на ўмовах канфідэнцыяльнасці, — тлумачыць кіраўнік фонду

Вольга АТРОШЧАНКА. — У любога з нас ёсць рэчы, пра якія мы не гатовыя казаць адкрыта. Кансультацыі праз дадатак — гэта адзін з тых шляхоў, які дазволіць атрымліваць праверэную і праўдзівую інфармацыю, заснаваную на фактах. І дасць магчымасць выкарыстоўваць яе так, каб не нашкодзіць ні сабе, ні блізкім.

БЕЛАРУСЬ — ЛІДАР ПА ЗНІЖЭННІ МАЦЯРЫНСКАЙ СМЯРОТНАСЦІ

Вольга Атрошчанка дадала, што сёння Беларусь — лідар па тэмпах зніжэння ўзроўню мацярынскай смяротнасці:

— Зніжэнне адбываецца хутчэй, чым ў іншых краінах. Смяротнасць складае ўсяго два выпадкі на 100 тысяч жыванароджаных. У нас добрыя колькасныя паказчыкі.

А вось работа з падлеткамі і моладдзю застаецца адным з важных напрамкаў. На жаль, пакуль вельмі многія аспекты, звязаныя з палавым выхаваннем і рэпрадуктыўным здароўем, або табуіраваны, або знаходзяцца пад уплывам стэрэатыпаў, паводле якіх маладыя людзі не маюць магчымасці казаць пра гэта адкрыта.

У 2019 годзе ў Беларусі правялі «Шматіндыкатарнае кластарнае абследаванне для ацэнкі становішча дзяцей і жанчын». Яно паказала, што толькі 53 % маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў дакладна ведаюць, якім чынам забяспечваць прафілактыку ВІЧ і СНІД, а таксама іншых захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам.

На жаль, гэта не такі добры паказчык. Мабільны дадатак і сайт, прысвечаныя палавому выхаванню, дапамогуць і маладым людзям, і іх бацькам павысіць узровень ведаў.

Толькі 53 % маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў дакладна ведаюць, якім чынам забяспечваць прафілактыку ВІЧ і СНІД, а таксама іншых захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам.

— Мы не можам не закрануць тыя праблемы, якія існуюць і ў нас, і ў іншых краінах: ВІЧ-інфекцыя, захворванні, якія перадаюцца палавым шляхам, падлеткавая цяжарнасць, аборты. Што, як не доступ да інфармацыі, да дапамогі, да кансультацыі, можа дапамагчы ўсяго гэтага пазбегнуць? — кажа Вольга Атрошчанка.

Intimatica з'яўляецца ўнікальным праектам на рынку ўсходняй Еўропы, таму што падае інфармацыю праз звыклыя падлеткам формы: відэа, мультфільмы. Праз мультыплікацыю можна проста тлумачыць складаныя рэчы.

ДАВЕР І ЦЕПЛЫНЯ

Асноўная мэта супрацоўніцтва фонду ААН у галіне народанасельніцтва і праекта Intimatica — даць просты доступ да інфармацыі. Пры гэтым навучаць мэтавую аўдыторыю, менавіта зацікавіўшы яе.

Спецыялісты праекта спадзяюцца не толькі ўмацаваць веды падлеткаў і іх бацькоў у сферы палавога выхавання, але і зрабіць іх адносіны больш даверлівымі і цёплымі. А самім падлеткам дапамагчы прыняць сябе і сваё цела ў такі няпросты перыяд жыцця, як сталенне.

Алена КРАВЕЦ.

Неабходна ведаць

Да 16-ці і пазней...

Лічыцца, што сексуальны інстынкт у дзяўчат «прачынаецца» бліжэй да 25, а вось у юнакоў — у 15—17. І менавіта ў гэтым узросце, ці нават раней хлопцы найчасцей за ўсё пачынаюць палавыя адносіны. Аднак варта памятаць, што жаданне наталіць сексуальную смагу можа скончыцца крымінальным пакараннем, нават калі «ўсё было па ўзаемнай згодзе».

Мінімальнага ўзросту, з якога можна пагаджацца займацца сексам, калі абодва партнёры — непаўналетнія, заканадаўствам не вызначана. Таму інтымныя стасункі паміж падлеткамі самі па сабе не з'яўляюцца ні адміністрацыйным, ні крымінальным злачынствам.

Аднак тым жа законам прадугледжана палавая недатыкальнасць непаўналетніх, якім не споўнілася 16 гадоў, з боку паўналетніх. Згодна з часткай першай артыкула 168 Крымінальнага кодэкса, за палавыя стасункі і іншыя дзеянні сексуальнага характару з асобай, якой не споўнілася 16 гадоў, прадугледжана абмежаванне волі паўналетняга да чатырох гадоў або пазбаўленне свабоды на гэткі ж тэрмін з выплатай штрафу.

Медустановы краіны на законных падставах перадаюць у міліцыю інфармацыю пра раннія сексуальныя стасункі падлеткаў (да 16 гадоў), каб гэтым адносінам далі прававую ацэнку. У такіх выпадках падлеткам забяспечаны разнастайныя праверкі — упэўніцца, што гэта быў не гвалт, не прымус і г. д. А калі яшчэ і цяжарнасць здарылася, то «разбор» палётаў будзе больш грунтоўны.

Дарэчы, згодна з часткай другой артыкула 168, калі сексуальныя дзеянні адбываліся не адзін раз (нават калі абодвум гэта падабалася), то віноўнага могуць пазбавіць волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

Крымінальная адказнасць для юнакоў, якія займаліся сексам з непаўналетнімі, наступае з 18 гадоў. Аднак калі палавая сувязь кваліфікуецца як згвалтаванне (артыкул 166) ці гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару (артыкул 167), то крымінальная адказнасць наступіць з 14 гадоў. Мужчынам жа ўвогуле лепш спытаць пашпарт у юнай дзяўчыны, якая можа аказацца не 18-гадовай чараўніцай, а 15-гадовай акселераткай. Пры гэтым закон дзейнічае аднолькава ў дачыненні да абвінавачванага. Няважна, звязалася з падлеткам паўналетняя «цётка» ці з дзяўчынкай — паўналетні «дзядзька».

Крымінальнае права вызначае ўзрост сексуальнай згоды (узрост згоды) як узрост, пачынаючы з якога чалавек лічыцца здольным даць інфармаваную згоду на ўступленне ў палавую сувязь з іншай асобай. У Беларусі гэта 16 гадоў.

З 2021 года, калі былі ўнесены змены ў кодэксы па пытаннях крымінальнай адказнасці, артыкул 168 быў дапоўнены невялікай заўвагай: калі пацярпелы пабраўся шлюбам ці ажаніўся з абвінавачванай у сексуальных дзеяннях асобай, злачынства перастае быць грамадска небяспечным.

Ірына СІДАРОК.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего ООО «Юрстайл групп»

(220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404)

проводит в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) на основании определений Экономического суда Минской области от 23.09.2022, 23.09.2022 по делу № 290-17Б/2019 открытый аукцион по продаже имущества ДУП «Передвижная механизированная колонна № 185» УП «Минскоблсельстрой»

(222410, Минская область, г. Вилейка, ул. Чапаева, 50, УНП 690018995) **в составе:**

Лот № 1:

• пилорама *(составные части и принадлежности: 3 (три) погреба, 2 (две) пристройки, 3 (три) склада, столярный цех, подвал, покрытие)* **с инв. № 631/С-58063 общей площадью 517,3 кв. м;**

• заправочная ГСМ *(составные части и принадлежности: склад, диспетчерская)* **с инв. № 631/С-58059 общей площадью 9,1 кв. м;**

• трансформаторная подстанция (ТП-32) *(составные части и принадлежности: электрические сети)* **с инв. № 631/С-66894 общей площадью 35,8 кв. м;**

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11/1, 4, 2.

• бункер с 2 циклонами для удаления древесных отходов, адрес местонахождения: Минская область, г. Вилейка, пос. Чапаева, 50.

Начальная цена без НДС – **120 390,00** бел. руб.

Начальная цена снижена на 50 %.

Задаток 10 % от начальной цены – **12 039,00** бел. руб.

Лот № 2: административное здание *(составные части и принадлежности: пристройка, туалет)* **с инв. № 631/С-13805 общей площадью 685,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11/8.**

Начальная цена без НДС – **85 000,00** бел. руб.

Начальная цена снижена на 50 %.

Задаток 10 % от начальной цены – **8 500,00** бел. руб.

Лот № 3:

• склад цемента *(составные части и принадлежности: навес, подвал)* **с инв. № 631/С-66993 общей площадью 23,5 кв. м;**

• склад извести *(составные части и принадлежности: навес, подвал, емкость)* **с инв. № 631/С-66992 общей площадью 128,4 кв. м;**

• склад с инв. № 631/С-66994 общей площадью 130,7 кв. м;

• лесопильный цех с инв. № 631/С-66991 общей площадью 476,6 кв. м.

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11/5, 7, 3, 6.

• силосные емкости для хранения цемента в составе: силос цемента, 4 шт. с **инв. № 4214274, адрес местонахождения: Минская область, г. Вилейка, пос. Чапаева, 50.**

Начальная цена без НДС – **56 400,00** бел. руб.

Начальная цена снижена на 50 %.

Задаток 10 % от начальной цены – **5 640,00** бел. руб.

Лот № 4: гараж-мастерские с инв. № 631/С-58065, общей площадью 1633,9 кв. м, расположенный по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11.

Начальная цена без НДС – **71 000,00** бел. руб.

Начальная цена снижена на 50 %.

Задаток 10 % от начальной цены – **7 100,00** бел. руб.

Недвижимое имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 621350100005000936 площадью 6,6550 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

Лот № 5: кран-балка в составе:

- кран-балка опорная электрическая пролетом 10,0 м;
- таль электрическая (тельфер) грузоподъемностью 3 т, высота подъёма 5 м;
- подкрановый путь длиной 54 м: 2 двутавра, высота полки 0,4 м.

Начальная цена без НДС – **4 340,00** бел. руб.

Начальная цена снижена на 30 %.

Задаток 10 % от начальной цены – **434,00** бел. руб.

Оборудование расположено по адресу: Минская область, г. Вилейка, пер. Колхозный, 11.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600 169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901 OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течении 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение, в размере: по лотам №№ 1–4 – 4 (четырех) процентов от цены продажи предмета аукциона, по лоту № 5 – 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на публикацию.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда»: по лотам №№ 1–4 – от 09.07.2022, 30.08.2022, по лоту № 5 – 21.06.2022, 13.08.2022.

Аукцион состоится **26.10.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.10.2022** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра: (8029) 685 36 77.

УНП 690018995

Центр Промышленной Оценки • ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ • ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**РУП «Минскэнерго» филиал «Слуцкие электрические сети», ул. Энергетиков, 1, 223610, г. Слуцк, Минская обл., 801795-61123**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Лот №	Наименование	Начальная цена, бел. руб., без НДС
1	**Оперативно-эксплуатационный пункт «Теребуты»** (помещение неустановленного назначения), инв. № 645/D-4343, общ. пл. 55.4 кв. м, расположенный по адресу: Минская обл., Стародорожский р-н, аг. Теребуты, пер. Энергетиков, 1-1	**16 250,00**

Шаг электронных торгов составляет 5 % от начальной цены предмета электронных торгов

